

ІВАН ШАМЯКІН ПАКУТУЕ АД БЯССОННІЦЫ... 11

МАСТАК ПАРЫЖСКАЙ ШКОЛЫ ШРАГА ЦАРФІН У МІНСКУ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

11 СНЕЖНЯ 2019 г. СЕРАДА № 235 (29102)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр СУБОЦІН, член Калегіі (міністр) па прамысловасці і АПК Еўразійскай эканамічнай камісіі:**

*«У 2020 годзе прадстаўнік Беларусі ўзначаліць Калегію ЕЭК. Краіна таксама будзе старшынстваваць у розных органах ЕАЭС. Асноўная задача старшынства Беларусі — выканаць усё, што запісана ў Дагаворы аб ЕАЭС, і тое, што закладзена ў стратэгіі еўразійскай інтэграцыі. Гэта чатыры асноўныя свабоды: перамяшчэнне тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы. Ад Беларусі чакаюць прарыву. Таму што ў Беларусі такая аўра — перадавой краіны, якая заўсёды спрабуе палепшыць нават тое, што ўжо добра працуе».*

# «КАЛЫХАНКА» — БЯСКОНЦАЯ РАДАСЦЬ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сталым чытачам «Звязды» дзіцячы ўзорны фальклорны гурт «Калыханка» прадстаўляць не трэба: па-першае, на старонках нашага выдання гэты калектыў неаднойчы быў героем фотарэпартажаў, фотазамалёвак, артыкулаў і інтэрв'ю, па-другое, на працягу некалькіх апошніх гадоў, менавіта ў 2010-м, 2013-м, 2014-м, 2016-м і 2018-м, газета друкавала календары з фатаграфіямі ўдзельнікаў гэтага гурта. Сёлета «Калыханцы» спаўняецца трыццаць гадоў, і звяздоўцы, вядома, не могуць такую падзею пакінуць без увагі. Тым больш што за час сталення калектыва ў нашым архіве назбіралася сапраўднае фотадасье пра маленькіх артыстаў, і не паказаць чытачу хоць каліўца з гэтага вялікага збору мы проста не можам. Таму госцем трынаццатай старонкі гэтым разам будзе менавіта калектыў з пасёлка Міханавічы Мінскага раёна і яго стваральніца і нязменны кіраўнік Ларыса РЫЖКОВА.

СТАР. 13

## КОРАТКА

- **Беларускія вытворцы прадставілі прадукцыю на выстаўках у Егіпце і ААЭ.**
- Памёр экс-мэр Масквы Юрый Лужкоў, які ўзначальваў расійскую сталіцу з 1992 да 2010 года. Спачуванні родным і блізкім нябожчыка выказаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.



- **ЕС укладзе больш за 5 мільёнаў еўра ў развіццё пунктаў пропуску «Брузгі» і «Бераставіца».**
- Х Мінскі міжнародны Калядны оперны форум пройдзе 12—18 снежня.
- **Усе міні-палігоны адходаў у Беларусі павінны быць рэкультываваныя не пазней за 2023 год.**

Святочнае

## КАЛІ ЗАПАЛІЛАСЯ ЗОРКА...

**У краіне пачалася дабрачынная навагодняя акцыя «Нашы дзеці»**



Фота БелТА.

Аднолькава важнае для дзяцей і дарослых мерапрыемства стартавала ў Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі ў Мінску. Па традыцыі ў гэты ж дзень адкрылася **XXIII Рэспубліканская выстаўка дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Калядная зорка».**

СТАР. 4

Сацыяльны праект

## «ШаноVныя гісторыі»: пераадолеем адзіноту разам

### Як у Гомелі вырашылі інтэграваць людзей сталага веку ў соцыум

**74-гадовая Ніна Сяргееўна лічыць, што бываюць выпадкі, калі побач муж або сям'я сына, а ты разумееш, што погляды ў іх іншыя і што ты не паспяваеш за змяненнем жыцця. «Мала каму цікавая мая гісторыя, тое, што я пераджыла і бачыла. І так у многіх маіх аднагодкаў», — горка прызнаецца жанчына. Яна і мае рацыю, і не мае яе адначасова. Сапраўды, многія пажылыя людзі, на жаль, адчуваюць сябе нецікавымі і нікому не патрэбнымі. Але тое, што гісторыі іх жыццяў ні ў кога не выклікаюць цікавасці, — у гэтым яны вельмі памыляюцца. І сацыяльны праект ТЦСАН Цэнтральнага раёна Гомеля «ШаноVныя» — яшчэ адно пацвярджэнне таму.**

Так, адзінота — гэта сур'ёзнае выпрабаванне. «Адной цяжка жыць, — кажа 73-гадовая Любоў Аляксандраўна з Гомеля. — Бацька і маці памерлі. Муж памёр. Дзяцей не было. Цяпер усё маё існаванне здаецца бессэнсоўным і нецікавым. Жыву адна, рэдка маю зносіны з суседзямі. Дапамагае сацыяльны работнік...» «Адзінота — калі мужа і дзяцей пахавала, — паўтарае за ёй 79-гадовая Марыя Паўлаўна. — Усё жыццё было шчасце, а цяпер няма. Застаецца толькі альбом глядзець, фотакарткі перабіраць...»

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2020 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## Пасля Сочы

**Адбылася тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Мядзведзевым. Пра гэта паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу беларускага лідара.**

Бакі абмеркавалі вынікі праведзеных 7 снежня ў Сочы беларуска-расійскіх перагавораў, далейшую работу па напаўненні інтэграцыйнага парадку дня, развіцці гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, знясці праблемных пытанняў у гэтай сферы.

Аляксандр Лукашэнка і Дзмітрый Мядзведзеў дамовіліся аб працягу кантактаў, каб да новага года зверыць гадзіннікі па адпаведнай праблематыцы.

# КАБ УСЁ ПАСПЕЦЬ

**Аляксандр Лукашэнка расказаў, як праўдзе навагоднія святы, — працоўная нагрузка будзе вялікая.**

У той час, як грамадзяне думаюць пра падарункі і карпаратывы на Каляды і Новы год, лідар краіны імкнецца вырашыць важныя дзяржаўныя пытанні і не цягнуць іх у 2020-ы. Сачыць, каб кіраўнік дзяржавы ўсё паспеў, даводзецца яго Адміністрацыі. Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў на сённяшняй нарадзе з палітычным штабам краіны ў Палацы Незалежнасці.

Нагрузка будзе вялікая, папярэдзіў Прэзідэнт, бо наперадзе — святы. Пачынаючы з дня каталіцкіх Каляд і ледзь не да 10 студзеня — суцэльныя мерапрыемствы, практычна кожны дзень з удзелам Прэзідэнта. А раніцай у аўторак у тэлефоннай размове яшчэ і з прэм'ер-міністрам Расіі дамовіліся аб сустрэчы ў пераднавагоднія дні, бо трэба «зверыць гадзіннікі» па пытаннях, што датычацца ўрадаў.

Усё гэта — не ўлічваючы яшчэ адну сустрэчу з Прэзідэнтам Расіі, якая таксама плануецца ў трэцяй дэкадзе снежня, каб канчаткова расставіць кропкі над «і» па найважнейшых пытаннях функцыянавання двух дзяржаў. «А галоўнае, нашых эканомік», — дадаў Прэзідэнт.

Пытанні функцыянавання Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўніком якой на мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка назначыў Ігара Сергеенку, абмеркавалі дэталёва. Пачалася размова з віншаванняў экс-кіраўніку Адміністрацыі Наталлі Качанавай з нагоды яе выбрання старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

«Папрасіў бы вас не расслабляцца, таму што клопату ў вас і па папярэдніх службовых абавязках будзе больш чым дастаткова, я ўжо іх анансаваў (Наталля Качанава — упаўнаважаная па Мінску. — ***«Зв.»***). Ну і Ігару Пятровічу трэба будзе дапамагаць у тым плане, каб ён хутчэй увайшоў у курс справы», — пажадаў Прэзідэнт.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

## Кадры найвышэйшай кваліфікацыі

**Сертыфікаваны навучальны цэнтр Festo (FACT) па тэхналогіях «Індустрыя 4.0» і мехатроніцы адкрыўся на базе каледжа сучасных тэхналогій у машынабудаванні і аўтасэрвісе ў Мінску.**

Ён стаў часткай вялікага праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі», што фінансуецца Еўрапейскім саюзам. Усяго на праект было накіравана каля 11,5 млн еўра.

Адкрыццю цэнтра папярэднічала карпатлівая работа Міністэрства адукацыі і Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі сумесна з прадстаўніцтвам Еўрапейскага саюза ў Беларусі, а таксама з кампаніяй «Festo» — адным з сусветных лідараў у аўтаматызацыі вытворчых працэсаў. Яе вынікам стала распрацоўка ўнікальнага праекта — першага на постсавецкай прасторы навучальнага цэнтра, які прайшоў сертыфікацыю па міжнародных стандартах: яны прызнаюцца больш чым на 200 тысячах прамысловых прадпрыемстваў па ўсім свеце.

Магчымасці цэнтра FACT дазволяць працаваць з навучэнскай моладдзю, весці падрыхтоўку і перападрыхтоўку дарослага насельніцтва. Абсталяванне і праграмнае забеспячэнне дапамогуць сфарміраваць кампетэнцыі ў вобласці праектавання CP Lab і CP Factory, праграмавання, практычныя ўменні і навыкі работы з прамысловымі і мабільнымі робатамі і іншыя.

Студэнты будуць вучыцца планаваць і думаць стратэгічна. У цэнтры плануецца арганізаваць сеткавае навучанне і абмен вопытам у арганізацыі і правядзенні спаборніцтваў па стандартах Wordskills. Будуць праходзіць заняткі ў тым ліку для навучэнцаў іншых каледжаў. Абсталяванне будзе задзейнічана на працягу ўсяго года. Для работы з навучэнцамі на базе цэнтра былі сертыфікаваны пяцёра выкладчыкаў каледжа.

— Поспехі дзяржавы ў сацыяльна-эканамічнай сферы залежаць ад якасці падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў на самых запатрабаваных прафесіях, — падкрэсліў падчас цырымоніі адкрыцця цэнтра **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** — Мы павінны не проста ісці ў нагу з часам, а апярэджваць яго, навучаць так, каб наш спецыяліст на вытворчасці мог у максімальна сціслыя тэрміны распачаць работу на абсталяванні прадпрыемства. Тут, у цэнтры, мы і будзем весці такую падрыхтоўку.

Праект «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі» рэалізуецца ў вядучых сектарах эканомікі, сярод якіх машынабудаванне, будаўніцтва, сфера абслугоўвання. Яго мэта — прывесці прапанову з боку сістэмы прафадукацыі ў адпаведнасць з патрэбамі рынку працы. Чакаецца, што гэта палепшыць перспектывы працаўладкавання моладзі і дарослага насельніцтва краіны і павысіць якасць і прывабнасць сістэмы прафесійнай адукацыі ў Беларусі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЦЫГАРЭТЫ ІМКЛІВА НЕ ПАДАРАЖЭЮЦЬ

## Прэзідэнт забараніў значна павялічваць цэны на тытунёвыя вырабы

**Здаецца, траціць здароўе за грошы — асабісты выбар кожнага, але ў «цыгарэтнай» праблеме значна больш дзяржаўнага. А для сучаснай Беларусі — і міждзяржаўнага. Менавіта таму, пачынаючы нараду ў Палацы Незалежнасці, Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка нагадаў: у перамовах з Расіяй сярод шматлікіх пытанняў знаходзіцца і цэнаўтварэнне, асабліва на адчувальныя тавары. Надышоў час абмеркаваць стан спраў у адным з сегментаў вытворчасці — тытунёвых вырабаў.**

«Натуральна, што пры ўсім негатыве тытуню, алкаголю, — гэта сур'ёзныя артыкулы пры фарміраванні нашага бюджэту. Таму тут не мусіць быць ніякіх шараханняў. Зразумела, што ў Расійскай Федэрацыі тытунь, ды і алкаголь па кошце значна вышэйшыя, чым у Рэспубліцы Беларусь. Калі што, уніфікацыя ў гэтым выпадку (на тытунёвыя вырабы) можа прывесці да сур'ёзнага росту цэн, што недапушчальна для Беларусі і грамадзян Беларусі», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

Сам Прэзідэнт сваіх адносін да цыгарэт не хавае, курыльшчыкаў не падтрымлівае.

«Адна справа — маё меркаванне, а іншая — самога чалавека, які бярэ цыгарэту, купляе за добрыя грошы і нішчыць сваё здароўе. Гэта пэўныя сацыяльныя пытанні», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

На нарадзе абмеркавалі вытворчасць і рэалізацыю тытунёвых вырабаў, асабліва з улікам сур'ёзнай «перабудовы» рынку, якая адбылася каля года таму, а таксама выкананне інвестыцыйных праектаў.

Як паведаміў журналістам міністр фінансаў Максім Ермаловіч, Прэзідэнта хвалюе, наколькі краіна абаронена ад нелегальнага ўвозу тытунёвай прадукцыі, абароту няякасных цыгарэт і алкаголю на ўнутраным рынку.

«Гутарка ідзе аб тым, каб гэты сектар працаваў выключна пад кантролем дзяржавы, каб у асноўным за кошт айчынных вытворцаў ажыццяўлялася насычэнне ўнутранага рынку тытунёвай прадукцыяй, каб у нас была магчымасць кантраляваць цэны на ўнутраным рынку. І галоўнае — гэта вельмі бюджэтаёмістая галіна, яна прыносіць значныя даходы. Тытунёвая прадукцыя абкладаецца акцызамі, адпаведна, і бюджэт вельмі залежыць ад таго, як сябе адчувае гэта прамысловасць», — растлумачыў Максім Ермаловіч.

Па яго словах, краіна ідзе па шляху паэтапнага павелічэння даходаў бюджэту: з году ў год даходы ад рэалізацыі тытунёвай прадукцыі на ўнутраным рынку ўзрастаюць. У бюджэт-2020 зноў закладзены рост даходаў ад тытунёвай прамысловасці. Сярод намаганняў, пералічаных міністрам фінансаў, — выкараненне ўхілення ад уплаты падаткаў, фактаў нелегальнага абароту, забеспячэнне вытворчых магутнасцяў тытунёвых фабрык.

Цяпер рынак пад кантролем, працягнуў міністр: выключаны любыя пастаўкі нелегальнай прадукцыі, напаўняльнасць бюджэту дастаткова высокая (больш за 800 мільёнаў рублёў акцызаў на тытунёвую прадукцыю, а ўсяго ад галіны — больш за мільярд дзвесце мільёнаў рублёў).

«Мяркуецца на наступны год і нязначнае павышэнне цэн на гэтую прадукцыю. Вядома, што ў межах бюджэту мы закладалі павышэнне ставак акцызаў на тытунёвую прадукцыю на 15 працэнтаў, — зыходзячы з гэтага, разлічаны даходы бюджэту на наступны год. У такіх умовах гэта нязначны ўплыў на цэны. Разам з тым мы павялічваем даходы бюджэту, уплываем на ўжыванне гэтага прадукту, які негатыўна ўплывае на здароўе насельніцтва, і не ствараем нейкіх цанавых «шокаў», не ўзмацняем інфляцыйны ціск на эканоміку краіны», — прытым, падкрэсліў кіраўнік фінансавага ведамства, і кантроль над абаротам такой прадукцыі будзе ўзмоцнены.

Зараз абмяркоўваецца ўніфікацыя акцызнай палітыкі ў ЕАЭС і ў Саюзнай дзяржаве. Па інфармацыі міністра фінансаў, Аляксандр Лукашэнка даклад на абазначыў умовы далейшага руху: не павінна быць негатыўнага ўплыву ні на стан унутранага рынку, ні на абарот нелегальнай прадукцыі, ні, адпаведна, рэзкага павелічэння цэн на прадукцыю для насельніцтва.

Акрамя таго, Максім Ермаловіч паведаміў, што тытунёвыя фабрыкі дастаткова паспяхова вырашаюць пытанне канкурэнтаздольнасці і павелічэння аб'ёмаў экспарту айчыннай прадукцыі.

Прэзідэнт праанансаваў разгляд у будучыні падобнага пытання, звязанага з вытворчасцю і рэалізацыяй алкагольных тавараў.

**Варвара МАРОЗАВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## «Нармандская чацвёрка» прыняла камюніке з трох пунктаў

Лідары краін «нармандскай чацвёркі» прынялі па выніках саміту ў Парыжы камюніке, паведамляе РІА Навіны.

Усяго ў выніковым дакуменце прапісаны тры пункты: «Неадкладныя меры па стабілізацыі сітуацыі ў зоне канфлікту», «Меры па рэалізацыі палітычных палажэнняў мінскіх пагадненняў» і «Працяг». У прыватнасці, бакі падтрымалі план па развядзенні сіл на трох новых участках у Данбасе да канца сакавіка 2020 года. Лідары «нармандскай чацвёркі» дамовіліся падтрымаць дамоўленасці кантактнай групы аб адкрыцці новых пунктаў пропуску ў Данбасе на працягу 30 дзён.

Таксама абмяркоўвалася пытанне аб абмене ваеннапалоннымі па прынцыпе «ўсіх на ўсіх» да канца 2019 года. Пры гэтым міжнародным арганізацыям, у тым ліку Міжнароднаму камітэту Чырвонага Крыжа, павінен быць дадзены поўны і безумоўны доступ да ўсіх асоб, якія ўтрымліваюцца. Па сцвярджэнні Кіева, гаворка ідзе «не пра дзясяткі, а пра сотні» людзей. Раней прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон расказаў, што наступным разам саміт у «нармандскім фармаце» збярэцца ў найбліжэйшыя чатыры месяцы.

## Амерыканскай эканоміцы прадказваюць апакаліпсіс



У амерыканскай эканоміцы можа адбыцца апакаліпсіс пасля прэзідэнцкіх выбараў, якія намечаны на восень 2020 года. Такое прадказанне зрабіў стратэг BTIG Джуліян Эмануэль, перадае CNBS. Паводле яго слоў, у сітуацыі, якая склалася, інвестары страхуюцца ад "магчымага апакаліпсісу на выбарах». Эксперт указаў, што гаворка можа ісці аб «вельмі нестабільным выніку галасавання». Цяпер рынак занепакоены ў тым ліку тым, што пасля выбараў гандлёвая вайна паміж ЗША і Кітаем толькі пагоршыцца.

Раней у пачатку снежня амерыканскі прэзідэнт Дональд Трамп паставіў пад сумненне падпісанне гандлёвага пагаднення з Кітаем да выбараў. Гэта прывяло да рэзкага абвалу фондавых індэксаў.

## Стральба ў чэшскай бальніцы

Учора раніцай невядомы расстраляў людзей у шпіталі ў горадзе Острава на ўсходзе Чэхіі, паведамляе Reuters. Паводле звестак чэшскай паліцыі, у выніку нападзення былі забітыя як мінімум чатыры чалавекі, пацыенты, якія чакалі прыёму, яшчэ двое параненых. Пазней міністэрства аховы здароўя краіны паведаміла аб шасці загінулых.

Супрацоўнікі бальніцы перапынілі сваю работу, там працавалі спецслужбы. У бальніцу прыбыў паліцэйскі спецназ і пажарныя, на месца здарэння накіроўваўся паліцэйскі верталёт. Стралок, які напаў на людзей, уцёк. Пасля таго, што адбылося, з'явіліся паведамленні, нібыта мужчына мог помсціць за смерць дзіцяці падчас родаў у гэтай бальніцы. Бліжэй да абеду чэшская паліцыя паведаміла ў сваім Twitter, што падазраваны ў стральбе налажыў на сябе рукі. Яго высачылі з дапамогай інфармацыі аб аўтамабілі, на якім стралок нібыта рухаўся па горадзе. Паліцыя ўстанаўлівае асобу мужчыны.



Хакей

# ГУЛЬНЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

Зборная Беларусі стартавала з перамогі на дамашнім маладзёжным чэмпіянаце свету, а ўчора сустрэлася з галоўнымі сапернікамі за выхад у эліту — зборнай Латвіі

**Латышы таксама пачалі мінскі турнір з упэўненай вікторыі, атрымаўшы перамогу над датчанамі, таму ўчарашні матч насіў прынцыповы характар у барацьбе за першае месца ў групе.**

Пасля першага дня спаборніцтваў чэмпіянату беларуская зборная лідзіруе па эфектыўнасці гульні ў большасці (40 працэнтаў), хоць матч з Аўстрыяй не стаў для нашых хлопцаў лёгкай прагулкай, а ў **галоўнага трэнера Дзмітрыя ДУДЗІКА** засталіся пытанні да сваіх падапечных. «Не змаглі мы, трэнеры, дастукацца да гульцоў, растлумачыць усю сур'ёзнасць патрабаванняў да камандных дзеянняў. Спадзяёмся, цяжкая перамога, на арэлях, прымусіць за ноч нашых добрых, сапраўды таленавітых гульцоў пераасэнсаваць сам працэс выступлення на чэмпіянаце свету. Трэба папрацаваць, каб дасягнуць пастаўленай мэты», — зазначыў настаўнік пасля гульні са зборнай Аўстрыі і выказаў надзею, што ў матчы з Латвіяй гэтых момантаў ужо не будзе.

Арганізатары турніру ў Мінску паведамілі, што сярэдняя наведвальнасць матчаў у першы дзень склала 2799 балельшчыкаў. Гэта найлепшы вынік маладзёжных чэмпіянатаў свету ў першым дывізіёне за апошнія гады. Дарэчы, папярэдні рэкорд належаў таксама Беларусі: у 2010 годзе на паядынкі маладзёжнага першынства ў Бабруйску ў першы дзень прыйшло амаль 3800 балельшчыкаў.









Каб дасягнуць такога выніку, беларуская арганізатары пастараліся на славу, акрамя відовішчнага хакея, чым заўсёды адрозніваюцца маладзёжныя чэмпіянаты, у Мінску балельшчыкі могуць знайсці сабе забавы для душы і ў перапынках. На «Чыжоўка-Арэне» арганізаваны фуд-корты і пункты гандлю атрыбутыкай з лагатыпамі чэмпіянату, пад гэта аддадзена практычна ўсё фае першага паверха. Таксама ёсць фота-зоны, каб усе ахвотныя змаглі захаваць момант не толькі ў сваёй памяці, але і на фота. На другім паверсе размясцілася ўсё для дзяцей — гульнявыя зоны, магчымасць памаляваць, пагуляць у настольны хакей, нанесці аквагрым.

Высокі ўзровень чэмпіянату адзначаюць ужо і госці. «Усё выдатна! Упэўнены, хлопцам падабаецца гуляць на такой класнай, вялікай арэне. Я ўжо быў у Мінску два ці тры гады таму са зборнай U-18, так што выдатна зноў апынуцца тут і адчуць топ-узровень», — адзначае трэнер нарвежцаў Андэрс Ёсе. «Ніколі раней не бываў у вашай краіне, але пакуль падстаў для расчаравання не было. Здаецца, усё на самым высокім узроўні», — расказаў нападаючы нарвежскай дружыны Понтус Фінстад.

Чэмпіянат працягваецца, і заўтра зборная Беларусі згуляе са зборнай Нарвегіі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота hockey.by**

## ПРАВЕРАЦЬ ЗАГОННЫЯ ПАЛЯВАННІ ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

**У Мінскім і Пастаўскім раёнах ужо выяўлены факты браканьерства, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Увесь снежань дзяржінспектары аховы жывёльнага і расліннага свету будуць праводзіць спецмерапрыемствы, скіраваныя на выяўленне парушэнняў пры правядзенні загонных паляванняў. Нярэдкія выпадкі, калі цэлыя калектывы паляўнічых аказваюцца датычныя да браканьерства. Асабліва попыт на дармовую дзічыну ўзрастае перад святкаваннем Новага года.

Першы этап мэтанакіраваных масавых праверак ужо адбыўся: у паляўнічых угоддзях па ўсёй краіне працавала 56 рэйдавых груп Дзяржінспекцыі, яны праверылі больш за 70 паляўнічых брыгад. Акрамя дробных парушэнняў правілаў былі выяўлены два факты незаконнага палявання з прычыненнем асабліва буйной шкоды.

У Мінскім раёне каля вёскі Дубіцкая Слабада пад кіраўніцтвам егера мясцовай структуры Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў палявалі восем жыхароў раёна. У якасці здабычы паляўнічыя прад'явілі тушу казулі. Побач з заплечнікам, набітым мясам, знаходзілася галава жывёлы. Па слядах ад скінутых рагоў інспектары вызначылі, што здабытая казуля з'яўляецца дарослым самцом, а не сяголеткам, на здабычу якога ў паляўнічых меўся дазвол. Егер, які працуе ў паляўнічай гаспадарцы ўжо шэсць гадоў, не мог не заўважыць розніцы. Па законе, пры наяўнасці ліміту ён павінен быў узяць з паляўнічага, які падстрэліў не тую асобіну, двайны кошт, але не зрабіў гэтага.

Пры больш дэталёвым аглядзе мясцовасці, дзе праводзілася паляванне, інспектары знайшлі свежыя рэшткі яшчэ дзвюх казуль. У іх незаконнай здабычы западозрылі тую ж паляўнічую брыгаду. Пошукі мяса працягваліся да таго часу, пакуль інспектары не зазірнулі пад дно егерскага УАЗа. Там, пад колам, прысыпаны лісцем і галінкамі, знаходзіўся заплечнік, а ў ім — часткі туш дзвюх казуль і нож.

Па выяўленых парушэннях заведзена крымінальная справа. Ступень вінаватасці кожнага з удзельнікаў палявання ўстановіць следства. Фігурантам пагражаюць буйныя штрафы з канфіскацыяй зброі і пазбаўленнем права на паляванне, магчыма таксама абмежаванне або пазбаўленне волі. Вінаватым давядзецца пакрыць шкоду ад незаконнай здабычы трох асобін казулі, а гэта больш за дзевяць тысяч рублёў.

Удзельнікі загоннага палявання ў Пастаўскім раёне таксама вырашыліся на грубае парушэнне, калі замест дазволенай да здабычы самкі лася падстрэлілі самца. Ліміты на здабычу самцоў у паляўнічай гаспадарцы былі ўжо вычарпаныя, а пасля гэтага іх адстрэл можа прывесці да парушэння біябалансу ў мясцовай папуляцыі. Па факце незаконнай здабычы самца лася праводзіцца разбіральніцтва.

Узмоцнены кантроль за правядзеннем загонных паляванняў працягнецца да заканчэння сезона. Застануцца ў полі зроку інспектараў і іншыя паляўнічыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## НЕСТАНДАРТНЫ ПАДЫХОД

«Зайцоў» у транспарце... узважаць!

**Сістэму па выяўленні безбілетнікаў у грамадскім транспарце распрацавалі ў БДУ. У аўтарскі калектыў увайшлі студэнты эканамічнага факультэта: трэцякурснікі Максім Талкачоў, Арцём Бабянок і чацвёртакурснікі Станіслаў Качалка і Арцём Латышаў.**




Для гэтых мэт вынаходнікі прапануюць выкарыстоўваць датчыкі вымярэння масы, што прыпадае на падвеску колаў транспартнага сродку, і лічыльнікі білетаў на праезд. Змяненне вагавых паказчыкаў пры захаванні або непрапарцыянальным ваганні звестак аб праязных квітках, якімі скарысталіся пасажыры, можа ўказваць на прысутнасць у транспарце безбілетнікаў.

Прыборы счытваюць інфармацыю падчас адкрыцця дзвярэй да пасадкі пасажыраў. Акрамя таго, сэрвіс дазваляе вызначыць загружанасць таго ці іншага маршруту і мэтазгоднасць выхаду на яго дадатковых транспартных сродкаў.

Інавацыйны праект студэнтаў БДУ ўжо атрымаў высокую ацэнку і быў прызнаны «Найлепшым сацыяльна значным рашэннем» на Міжнародным калядным хакатоне. Фінал спаборніцтва прайшоў адначасова ў Бельгіі і Францыі ў фармаце тэлемоста. Усяго перспектыўныя ідэі для лічбавай эканомікі распрацоўвалі 16 камандаў з Францыі, Бельгіі, Швецыі, Беларусі і Расіі. Абсалютным пераможцам стала зборная са Швецыі. Таксама былі вызначаны найлепшыя стартапы ў намінацыях: «Абсалютны чэмпіён», «Найлепшае рашэнне прыкладной задачы», «Найлепшае адукацыйнае рашэнне», у тым ліку, гейміфікацыя» (у сферы «Адукацыя і кадры»).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПА ПАДАРУНКІ — ЯК НА РАБОТУ...

За серыю крадзяжоў з гандлёвых цэнтраў затрыманы 30-гадовы расіянін

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС Мінска затрыманы 30-гадовы грамадзянін Расіі, які выкрадаў рэчы з гандлёвых цэнтраў сталіцы.**

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, на лінію 102 звярнуўся адзін з супрацоўнікаў крамы электратэхнікі, размешчанай у гандлёвым цэнтры на вуліцы Бабруйскай, паведаміўшы, што невядомы мужчына выкраў тэхніку на суму каля 2000 рублёў. Таксама заяўнік расказаў, што спрабаваў самастойна затрымаць зладзюжку, аднак зрабіць гэтага яму не ўдалося.

Падчас правядзення комплексу аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў было ўстаноўлена, што да крадзяжу рэчаў акаязаўся датычны 30-гадовы грамадзянін Расійскай Федэрацыі. Праваахоўнікі затрымалі яго на вуліцы Мсціслаўскай, калі той выходзіў з гандлёвага цэнтра. Пры сабе ў падазраванага былі знойдзены некалькі адзінак новай бялізны, крадзеж якой ён здзейсніў незадоўга да затрымання.

Праваахоўнікам мужчына растлумачыў, што некалькі дзён таму прыехаў у сталіцу з мэтай набыцця падарункаў. Аднак цэны ў мінскіх крамах для грамадзяніна Расіі здаліся надта высокія, таму мужчына пайшоў на крадзеж.

Са слоў падазраванага, ён дзейнічаў па наступнай схеме: накіроўваўся ў гандлёвыя цэнтры, заходзіў у крамы, якія падабаліся, і выкрадаў рэчы незаўважна для прадаўцоў. За чатыры дні расіянін здолеў скрасці: куртку, паліто, сумку, пяць «разумных гадзіннікаў», шэсць партатыўных калонак і дзесяць найменняў ніжняй бялізны. Агульная сума «здабычы» склала 3523 рублі.

Вядома, што на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі мужчына ўжо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВЫБУХ У ДРАГІЧЫНЕ:

пацярпелі людзі, пашкоджаны кватэры

**Надвячоркам у панядзелак прагрымеў выбух у пяціпавярховым шматкватэрным жылым доме па вуліцы Карла Маркса ў Драгічыне. Надзвычайнае здарэнне адбылося пры мантажы нацяжной столі. Работу праводзілі супрацоўнікі прыватнага прадпрыемства.**

Паводле звестак на сайце МНС, выбух газапаветранай сумесі без наступнага гарэння адбыўся ў кватэры на другім паверсе. У выніку пашкоджана шэсць кватэр. У бальніцу былі дастаўлены чатыры чалавекі. Двое мантажнікаў, якія праводзілі работы, пацярпелі моцна, іх шпіталізавалі ў рэанімацыю. На жанчыну, жыхарку суседняй кватэры, упаў кавалак сцяны, у выніку яна атрымала ўдары. Пазней бацькі падвезлі дзіця, якое таксама пацярпела падчас здарэння.

Няшчасце адбылося ў цагляным доме 2008 года пабудовы. Цяпер там працуе аператыўна-следчая група. Жыхары суседніх кватэр адселеныя.

Як паведаміў карэспандэнту газеты **намеснік старшыні Драгічынскага райвыканкама Уладзімір НЕРАД**, пасля правядзення кансіліуму мясцовых і брэсцкіх спецыялістаў пацярпелых мантажнікаў пераводзяць у спецыялізаваную клініку сталіцы. Яны знаходзяцца ў стабільна цяжкім стане. Здароўю і жыццю жанчыны і дзіцяці, якія таксама аказаліся на бальнічных ложках, нічога не пагражае, ім акажуць неабходную дапамогу ў мясцовай бальніцы.

— Пасля таго як праваахоўныя органы скончаць работу на месцы здарэння, — расказаў Уладзімір Нерад, — туды зойдуць спецыялісты, якія падрабязна ацэняць пашкоджанні жылых памяшканняў. Затым будзе прынятае рашэнне аб памерах і формах аказання дапамогі на рамонт і аднаўленне жылля і маёмасці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Нашы дзеці

# Мары здзяйсняюцца

**Другі Мінскі абласны фестываль творчасці дзяцей-інвалідаў «Запалі сваю зорку» прайшоў у Дзяржынску. Больш за 200 хлопчыкаў і дзяўчынак з усіх куткоў цэнтральнага рэгіёна падзяліліся сваёй творчасцю з гасцямі і ўдзельнікамі свята.**

У фае гарадскога дома культуры разгарнулася выстаўка выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Юныя таленты прадставілі ўнікальныя пейзажныя замалёўкі, вышыўку, фларыстычныя карціны, работы з элементамі бісерапляцення.

Музычныя і харэаграфічныя кампазіцыі, тэатральныя мініяцюры, чытанне паэтычных твораў, разнастайная канцэртная праграма парадавалі гледачоў. Але, бадай, галоўным тут з'яўляецца не выканаўчае майстэрства маладых артыстаў, хоць і яно на даволі высокім узроўні, а тая атмасфера, якую адчулі ўсе прысутныя ў зале.

Гасцямі абласнога фестывалю сталі бацькі, сябры, педагогі, кіраўніцтва вобласці і раёнаў.

— На Міншчыне сёння дадзены старт акцыі «Нашы дзеці», — адзначыў **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ.** Ён падзякаваў арганізатарам гэтай акцыі — галоўнаму ўпраўленню па адукацыі Мінаблвыканкама і раённым выканаўчым камітэтам. «Дзеці — наша будучыня, а дзеці з абмежаванымі магчымасцямі такія ж адораныя, і педагогам неабходна дапамагаць раскрываць іх талент», — лічыць Іван Станіслававіч.

Фестываль «Запалі сваю зорку» на Дзяржыншчыне стаў традыцыйным — праводзіцца сямнаццаты год запар. А маштабнае абласное свята прайшло тут у другі раз.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# КАЛІ ЗАПАЛІЛАСЯ ЗОРКА...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Да маленькіх гасцей з падарункамі завіталі Дзед Мароз са Снягуркай ды калядоўшчыкі з казой. Выставачная зала цэнтра творчасці ператварылася ў скарбонку добрых спраў з песнямі, танцамі, карагодамі і ўсмешкамі, какажуць арганізатары свята.

Штогод вырабы малечы ўражваюць якасцю і арыгінальнасцю выканання. Больш за 400 найлепшых работ з усіх куточкаў Беларусі трапілі на выстаўку. Вось імчыць у санях, запрэжаных конямі з саламянымі грывамі, сама Снежная каралева. Непадалёк цэлая калядная батлейка з керамічнымі фігурамі. А крыху збочыш — і трапіш у вёску з царквой ды дамкамі з лямцу, дзе над комінамі ўздымаецца дым з воўны. Побач са скрыняй з ёлачнымі шарамі з пап'е-машэ, якія складана адрозніць ад шкляных, пра нешта думаюць мяккія лялькі-снегавікі.

У куточку пра нешта размаўляюць пацук у шыкоўным камзоле і мыш у паліто і акулярах з цеста. Гаспадарлівая мыш у тканым кажушку выпраўляецца ў лес па елку, а трыа мышэй з нітак наярваюць на балалайцы, скрыпцы ды гармоніку. А па сценах — габелены, ручнікі, выцінанкі, тканыя карціны, саламяныя шэдэўры. Цеста, фанера, бавоўна, лён, салома, дрэва, тканіна, ніткі... Здаецца, гэтыя чараўнікі могуць зрабіць прыгажосць з чаго заўгодна.


Фота БелТА.

— *Мы ўсе чакаем навагодніх свят, верым у цуды, запальваем агні на ёлках. У межах акцыі без увагі не павінна застацца ні адно дзіця ў нашай краіне. І мне хацелася б, каб сённяшняя атмасфера прадоўжылася ўсе святы і прывяла нас да калейдаскопа цудоўных і казачных мерапрыемстваў,* — выказаў надзею, віншуючы дзяцей і дарослых са святам, **Аляксандр КАДЛУБАЙ, намеснік міністра адукацыі** і пажадаў малым расці шчаслівымі, самадастатковымі і дарыць шчасце блізкім і родным.

Без падарункаў ад Дзеда Мароза, які запаліў сімвалічную чароўную калядную зорку, не застаўся ніводзін з маленькіх гасцей і артыстаў. Тым больш што на майстар-класе кожны зрабіў сабе яшчэ навагоднюю паштоўку.

Акцыя «Нашы дзеці» працягнецца ў краіне да 10 студзеня, а выстаўка «Калядная зорка» будзе радаваць сваёй разнастайнасцю да 25 студзеня.

**Ірына СІДАРОК.**

Сацыяльная падтрымка



# ЗАМЕСТ АДНАРАЗОВАГА ПОСУДУ — ПРАДУКТЫ І ДАКУМЕНТЫ

## Чаму бяздомных людзей пачалі карміць з металічных талерак

**«Са звычайным посудам нічога не параўнаецца! Раней наліваў суп у гэтую пластыкавую талерку, а яна ўся гнулася. Вось і думай, як данесці ежу да чалавека», — кажа каардынатар грамадскай арганізацыі «Водгук» Валерый ЕРАНКЕВІЧ. Кожны будні дзень мужчына корміць абедамі ў Мінску каля 70 чалавек, якія з розных прычын засталіся без дому і сродкаў на пражыванне. Узімку, калі гарачае харчаванне асабліва неабходна, гэта лічба павялічваецца ўдвая. Існуе такі пункт выдачы ежы выключна на спонсарскія грошы. За год толькі на аднаразовы посуд траціцца каля 1200 долараў, а трэба ж яшчэ купляць прадукты, аплачваць камуналку і дапамагаць людзям аднаўляць дакументы — таму кожная капейка лічыцца.**

Цэнтр экалагічных рашэнняў перадаў арганізацыі металічны посуд і пасудамыечную машыну, каб яна магла крыху сэканоміць на расходах, а таксама скараціць колькасць пластыкавага смецця.

Месца, дзе бяздомныя могуць адзін раз на дзень бясплатна паесці, знаходзіцца недалёка ад метро. Калісьці тут быў дзіцячы садок, але даўно не фарбаваныя сцены і дзверы ўжо мала пра гэта нагадваюць. На будынку няма спецыяльнай шыльды. Той, каму трэба, і так ведае сюды дарогу.

Пакой, дзе стаяць вялікія сталы, ужо амаль запоўнены. Разам з намі заходзіць яшчэ некалькі бабулек з торбамі і садзяцца побач з астатнімі. Усе чакаюць абеду. Хтосьці сядзіць моўчкі, хтосьці пра нешта гутарыць. Аднак як толькі з'яўляецца відэакамера ці фотаапарат, большасць пачынае хавацца, асабліва гэта не падабаецца жанчынам, яны просяць іх не здымаць.

У гэты час на кухні ўвіхаецца Валерый. Сёння ён гатуе кіслую капусту на першае і рыс з мясам на другое. А замест кампоту разлівае ў шкляначкі салодкі напой. Пакуль раскладвае ежу ў новыя талеркі, расказвае пра сваё жыццё і пра тое, як апынуўся тут:

— Прыйшоў да гэтага праз веру. Зразумеў, што, нават калі табе дрэнна, трэба дапамагаць тым, каму яшчэ горш. У мяне ў жыцці таксама ўсякае было, але п'янкі-гулянкі да дабра яшчэ нікога не давялі. Я шмат паездзіў па свеце, працаваў у цыганскай суполцы ў Падольску, у розных рэлігійных рэабілітацыйных цэнтрах. Бачыў, як людзі паміраюць ад сваіх слабасцяў. Я заўсёды кажу, што чалавек сам нясе адказнасць за свае ўчынкі. Аднак памыліцца можа кожны, таму шанц выправіцца павінен быць ва ўсіх. Да таго ж ёсць людзі, якія проста апынуліся заложнікамі сітуацыі, — кагосьці падманулі сваякі, кагосьці «чорныя рыэлтары». Да нас з кожным годам прыходзіць усё больш старых і хворых людзей. Не пускаем мы толькі п'яных. Калі яны знайшлі грошы на выпіўку, могуць знайсці і на ежу. З бяздомнымі я працую дваццаць гадоў, непасрэдна кармленнем займаюся чацвёрты год. Я ж кухар па адукацыі.


Каардынатар грамадскай арганізацыі «Водгук» Валерый ЕРАНКЕВІЧ.

Двое мужчын расстаўляюць талеркі з гарачай ежай на падносы і хутка нясуць іх у пакой. Насамрэч часу не так шмат, хутка прыйдуць яшчэ людзі, бо ўсіх адразу размясціць не атрымліваецца. Кормяць бяздомных тут на працягу дзвюх гадзін пяць дзён на тыдзень акрамя выхадных.

— Сёння ў нас вельмі добрая падзея. З гэтага дня мы пачнём есці з металічнага посуду, каб, па-першае, утвараць менш пластыкавага, а па-другое, сэканоміць грошы, за якія мы куплялі аднаразовы посуд. Гэтыя сродкі можна накіраваць на больш карысную справу. Напрыклад, на аднаўленне дакументаў, — радуецца Валерый, пакуль валанцёры расстаўляюць талеркі.

— Дзякуем Богу, што ён пабудзіў вас на такія дзеянні, — адказвае адзін з мужчын, і яго адразу падтрымліваюць астатнія.

Дарэчы, бяздомныя могуць прыйсці сюды не толькі паесці: за гадзіну да абеда альбо сам Валерый, альбо запрошаныя прапаведнікі выступаюць з прамовай, каб падтрымаць слабых людзей і накіраваць аблудных.

Арцёму 47 гадоў. Першы раз на такі абед ён прыйшоў мінулым летам. З тых часоў працуе тут валанцёрам. Пра тое, як апынуўся ў такой сітуацыі, мужчына гаварыць не вельмі хоча. Адзначае толькі, што так склаліся абставіны.

— Проста прыходзіць есці і сыходзіць я не мог, таму вырашыў застацца валанцёрам. Я чалавек такі, калі мне дапамагаюць, то і я дапамагаю, — расказвае Арцём, пакуль мые і расстаўляе чыстыя талеркі. — У мяне праблемы з дакументамі, таму работу знайсці складана, цяпер з справай іх аднавіць. Раблю ўсё сам, бо так прывык. Жыву пакуль у сяброў. Прыходжу амаль кожны дзень, часам застаюся дзяжурыць і на выхадных. Усяго нас тут чацвёра валанцёраў — Валерый старшы, яшчэ некаторыя бабулі часта застаюцца. Яны прыбіраюць са сталоў, выносяць смецце, падмятаюць.

З надыходам зімы неабходнасць у гарачай ежы з'яўляецца ў большай колькасці людзей. Летам ёсць грыбы, ягады. Арцём адзначае, што шмат хто сабе зарабляе іх продажам.

У пакоі пачынаюць есці і адначасова з гэтым задаваць пытанні супрацоўнікам Цэнтра экалагічных рашэнняў пра тое, калі запрацуе дэпазітна-залогавая сістэма, пачым яна будзе прымаць бутэлькі, чаму і куды знікала папяровая ўпакоўка.

— Што вы здзіўляецеся, яны пра ўсё ведаюць. Тут у некаторых па дзве вышэйшыя адукацыі, — адзначае Валерый.

У пункце выдачы ежы заўсёды патрабуюцца прадукты (асабліва цэніцца сала, бо яго можна даць з сабой), гаспадарчае мыла, цёплыя рэчы (шапкі, шалікі, рукавіцы і г. д.), чыстая бялізна, таксама спатрэбіцца і посуд, бо шклянкі могуць разбіцца, талеркі і лыжкі — згубіцца. І вельмі патрэбны валанцёры!

— Гэтай ініцыятывай мы хацелі паказаць, што дапамагаць нескладана. Камплект металічнага посуду каштуе ўсяго два рублі, мы за каву больш плацім, — падкрэсліла **супрацоўніца Цэнтра экалагічных вырашэнняў Марыя СУМА.** — Усе праблемы — і сацыяльныя, і экалагічныя — вельмі звязаныя. Немагчыма вырашаць экалагічныя пытанні і быць абыякавымі да сацыяльных.

Абед для першых дваццаці чалавек заканчваецца, людзі пачынаюць сыходзіць. Валанцёры, якія, здаецца, ніводнага разу не прыселі, накрываюць на стол. І праз некалькі хвілін у пакоі зноў чувацьстук лыжак.

**Кацярына ЦІТОВА.**
**Фота Таццяны КУЗНЯЦОВАЙ.**

З нагоды

# Да 20-годдзя Саюзнага дагавора

**6 снежня ў Прадстаўніцтве Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску адбылася прэзентацыя паштовага праекта «20 гадоў з дня падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы».**

У ёй удзельнічалі намеснік дзяржаўнага сакратара — член Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы Віктар Сірэнка, кіраўнік Прадстаўніцтва Пастаяннага Камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Мар'яна Шчоткіна і першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Сяргей Несцяровіч.

Паштовы праект падрыхтаваны Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам паштовай сувязі «Белпошта»



сумесна з Пастаянным Камітэтам Саюзнай дзяржавы.

Мастацкай асновай блока сталі дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі — гербы і сцягі дзвюх краін.



Перадсвяточнае

## Як пошта рыхтуецца да Новага года

# ДРЭВА РАДАСЦІ І ЛІСТ ДЗЕДУ МАРОЗУ

**Менш чым тры тыдні застаецца да надыходу 2020 года. Па ўжо даўняй традыцыі беларуская пошта рыхтуецца не толькі да гэтага свята, але і да Калядаў. Бо менавіта ў апошнія дні старога і першыя дні новага года шмат хто хоча павіншаваць сваіх блізкіх і родных. Але адна рэч — дасланае ў месенджары ці на электронную пошту паведамленне, і зусім іншая — падпісаная ад рукі паштоўка.**




— Так, са з'яўленнем хуткасных варыянтаў перадачы інфармацыі функцыі паштоўкі крыху змяніліся, але прызначаная радавацъ — яна адыгрывае сваю ролю і па гэты дзень, — кажа **прэс-сакратар РУП «Белпошта» Вікторыя ДЖУХУНЯН.** — Так шмат у ёй чалавечнасці, цяпла, чакання свята. Менавіта таму наша паштоўка — гэта не проста распрацаваны дызайн, растыражаваны на каляровым кардоне, а значна большае — жывыя эмоцыі, пачуцці, адносіны, самавыяўленне. Таму мы штогод распрацоўваем святочную калекцыю паштовак, картак, канвертаў калядвай і навагодняй тэматыкі.

Такім чынам, сёлета да выбару пакупнікоў — некалькі дзясяткаў святочных сюжэтаў. На паштоўках адлюстраваны выявы Дзеда Мароза, Снягуркі і кампазіцыі з ёлачнымі цацкамі, мандарынамі, гадзіннікамі, белымі мішкамі на лёдзе, снегірамі... Дызайн паштовай прадукцыі распрацоўваецца выключна з улікам тэхнічных магчымасцяў прадпрыемстваў паліграфічнай галіны. Сярод «фішак» — пластызоль белага і жоўтага колеру, цісненне гладкай каляровай і тэкстурнай фольгай, тэрмапад'ём. Усё гэта робіцца для таго, каб кожная паштоўка займела ўласны стыль. І — прыемная разыначка — вялікая частка святочнай прадукцыі аформлена па-беларуску.

Яшчэ 7 кастрычніка былі выпушчаны мастацкія маркіраваныя канверты «Са святам Божага Нараджэння!», «З Новым годам!» і «З Раством Хрыстовым і Навалеццем!» Іх тыраж склаў 60, 110 і 100 тысяч экземпляраў адпаведна.

Акрамя таго, 30 кастрычніка Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла ў абарачэнне паштовыя маркі «З Калядкамі!», «З Раством Хрыстовым!», «З Новым годам!». Маркі аддрукаваны тыражом 60 тысяч экзэмпляраў. Да таго ж былі адмыслова падрыхтаваны карткі для картмаксімумаў. Гэта мастацкая паштоўка, на ілюстраваным баку якой наклеена паштовая марка. Па сюжэце такая марка супадае з ілюстрацыяй карткі. Падстава, час і месца яе гашэння таксама мусяць адпавядаць сюжэту як карткі, так і маркі.

Навагоднюю паштовую прадукцыю можна купіць ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Беларусі, а таксама ў інтэрнэт-краме shop.belpost.by і на ярмарках-кірмашах у круглай і пасылачнай залах Галоўпаштамта ў Мінску.

## НА СУВЯЗІ — ДЗЕД МАРОЗ

Дарэчы, на Галоўпаштамце арганізуюць адмысловую навагоднюю фотазону. У ёй гасцей стануць чакаць Дзед Мароз і Снягурка. На жаль, рабіць яны гэта будуць толькі па дзве гадзіны ў вызначаныя дні.

Расклад святочнага дзяжурства наступны. 20, 24 і




30 снежня казачныя персанажы чакаюць гасцей з 14 да 16 гадзін. Для тых, у каго не атрымаецца прыйсці ў гэты час, зарэзерваваны прамежак з 16 да 18 гадзін 26 снежня. Свята разлічана на сямейны фармат. Калі дарослыя змогуць сфатаграфавацца на памяць у святочнай атмасферы, то дзеці атрымаюць магчымасць падзяліцца з Дзедам Марозам і Снягуркай сваімі запаветнымі жаданнямі.

— Дарэчы, самыя цікавыя здымкі будуць апублікаваны ў групах РУП «Белпошта» ў сацыяльных сетках, — працягвае суразмоўца. — Для гэтага іх трэба апублікаваць з хэштэгамі #belpost і #белпочта. Між іншым, яркія навагоднія фотазоны арганізаваны і ў вылучаных аддзяленнях паштовай сувязі.

У круглай зале Галоўпаштамта ўстаноўлена спецыяльная скрыня. Напісаць пра свае пажаданні і мары можна наўпрост Дзеду Марозу і Снягурцы. Але для гэтага не трэба ехаць у Мінск з іншых гарадоў — навагодняе пасланне можна адправіць з любога аддзялення паштовай сувязі. Каб зрабіць гэта, трэба проста правільна ўказаць адрас: 225063, рэзідэнцыя Дзеда Мароза ў Белавежскай пушчы (вёска Каменюкі, Брэсцкая вобласць).

Праўда, да апошніх дзён года цягнуць з выкладаннем сваіх думак у эпісталярным жанры не варта. Практыка паказвае, што менавіта на іх і прыпадае асноўная колькасць адпраўленых паштовак. І Дзед Мароз проста не паспее прачытаць за гэты час тысячы дасланых лістоў.

16 снежня Дзед Мароз святкуе свой дзень нараджэння. Улюбёны казачны персанаж чакае, што хлопчыкі і дзяўчынкі адправяць яму маляўнічыя, цёпла напісаныя лісты з аповедамі пра сябе, зробленыя ў адыходзячым годзе добрыя ўчынкі. «Белпошта» дапамажа дзецям: у гэты дзень у вылучаных аддзяленнях сувязі будуць устаноўлены адмысловыя паштовыя скрыні, куды можна будзе апусціць ліст. І канешне ж, сфатаграфавацца на памяць.

А яшчэ кожны з нас можа далучыцца да невялікай, але вельмі пачэснай справы. Вось ужо шосты год «Белпошта» праводзіць спецыяльную акцыю «Падары дзіцяці радасць». Сутнасць яе простая — кожны чалавек можа аформіць дабрачынную падпіску на газеты і часопісы, якія будуць прыходзіць на адрас аднаго з дзіцячых дамоў або прытулкаў. За гэты час часцінку радасці чытання дзецям, з якімі жыццё абышлося не вельмі добра, падарылі ўжо тысячы дарослых. Сімвалічнае дрэва з яблыкамі, на якіх пазначаны імёны, узрост і адрас дзяцей, размешчана ў будынку Галоўпаштамта. Не заставайцеся ж убаку і вы!

# Памятнае гашэнне ў Азербайджане

**На мінулым тыдні ў Баку прайшла 25-я Азербайджанская міжнародная выстаўка «Тэлекамунікацыі, інавацыі і высокія тэхналогіі» — Bakutel-2019.**

Гэтым разам яна сабрала больш за 200 удзельнікаў з 20 краін свету. У іх ліку — і дэлегацыя з Беларусі на чале з міністрам сувязі і інфарматызацыі Канстанцінам Шульганам.

Нацыянальны стэнд Беларусі наведалі кіраўнік Азербайджана Ільхам Аліеў і першая віцэ-прэзідэнт Мехрыбан Аліева.

Ільхам Аліеў узяў удзел у цырымоніі гашэння паштовых марак з серыі «Сумесны выпуск Беларусі і Азербайджана. Народныя казкі» і маркіраванага канверта, прымеркаванага да выстаўкі.

**Сяброў у новым годзе не мяняюць!**

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на І квартал або І паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка рэкламнай гульні «Звязда» саграваe!», выразайце і дасылайце яе да 12 студзеня 2020-га ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013.

**Сярод падпісчыкаў 17 студзеня 2020 года будуць разыграны сем двухбаковых пледаў з лагатыпам «Звязды» і суперпрыз — КАВАВАРКА эспрэса Vitek.** Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 27 студзеня 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 сакавіка 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 сакавіка выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Тэлефон для даведак — (017) 263 66 73.**

Правілы рэкламнай гульні чытайце ў нумары «Звязды» за 30 лістапада.

Тэрмін правядзення гульні — з 1 снежня 2019 года да 31 сакавіка 2020 года.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3694 ад 26.11.2019 выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.



**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або І паўгоддзе 2020 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________ (аддзяленне сувязі)

____________________ на І квартал або І паўгоддзе 2020 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) [ ] (індэкс) ____________________

Удачы ў розыгрышы!

Матэрыялы выпуску падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК. Ілюстрацыі падрыхтаваны РУП «Белпошта».

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 16 января 2020 года проводит 1-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108710051 дв. 17526 1987 г. *4 кат. 8 408 км* | г. Минск, в/ч 63755 | 80 000,00 | 16 000,00 |
| 2 | Гусеничное шасси МТ-Лбу (демилитаризованное) ш. 108501022 дв. 914407 1985 г. *4 кат. 382 км* | г. Минск, в/ч 63755 | 85 000,00 | 17 000,00 |
| 3 | Грузовой бортовой КрАЗ-260 ш. 0684790 дв. 29629 1990 г. *4 кат. 34 952 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 7500,00 | 1500,00 |
| 4 | Грузовой бортовой КрАЗ-260 ш. X1C000260L0684302 дв. 25429 1990 г. *4 кат. 79 447 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 7000,00 | 1400,00 |
| 5 | Грузовой бортовой Урал-4320 ш. 079206 дв. 109925 1987 г. *4 кат. 78 405 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8300,00 | 1660,00 |
| 6 | Грузовой бортовой Урал-432000-01 ш.172021 дв. 762933 1991 г. *4 кат. 98 050 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8200,00 | 1640,00 |
| 7 | Грузовой бортовой Урал-4320-0011 ш. 012134 дв. 407964 1982 г. *3 кат. 84 238 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8200,00 | 1640,00 |
| 8 | Автошасси КамАЗ-43101 ш. 0002021 дв. 0459844 1989 г. *4 кат. 47 459 км* | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 8500,00 | 1700,00 |
| 9 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К-375 в составе: Кузов-фургон К-375 № 101952 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 451055 дв. 729735 1986 г. *4 кат. 8 545 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 6500,00 | 1300,00 |
| 10 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К2-375 в составе: Кузов-фургон К2-375 № 081516 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 449730 дв. 690774 1986 г. *4 кат. 5 300 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 6500,00 | 1300,00 |
| 11 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К2-375 в составе: Кузов-фургон К2-375 № 020333 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 444700 дв. 574771 1986 г. *4 кат. 4 632 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 6500,00 | 1300,00 |
| 12 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К2-375 в составе: Кузов-фургон К2-375 № 081521 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 449474 дв. 682016 1986 г. *4 кат. 5 330 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 6500,00 | 1300,00 |
| 13 | Специальный автомобиль Урал-375АМ с кузовом-фургоном К-375 в составе: Кузов-фургон К-375 № 101953 1986 г. *4 кат.* Автошасси Урал-375АМ ш. 451279 дв. 734240 1986 г. *4 кат. 4 360 км* | г. Береза, в/ч 23324 | 6500,00 | 1300,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **16 января 2020 г. в 10.30.**
К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 13 января 2020 года**.
Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **16 января 2020 г. с 9.00 до 9.45.**
**Победитель аукциона обязан:**
1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона**.**
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.
Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, без НДС. **Справки по тел./факс: (017) 398 05 41**

# ИЗВЕЩЕНИЕ

## о проведении аукциона Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат» в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А. в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

| № Лота | Наименование объекта | Инвентарный номер согласно данным бух. учета | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **Комплекс имущества в составе:** | | **721 890,66** | **72 189,00** |
| ***№ п/п*** | **Недвижимое имущество:** | | | |
| *1* | **здание проходной**, общ. пл. – 15,3 кв. м, инв. № 602/С-45283, **административный корпус с лабораторией и складом**, общ. пл. 2059,9 кв. м, инв. № 602/С-45282, **цех безалкогольной продукции,** общ. пл. – 2672,7 кв. м, инв. № 602/С-24226, **винный цех,** общ. пл. – 937,1 кв. м, инв. № 602/С-24225**, лукумный цех,** общ. пл. – 516,9 кв. м, инв. № 602/С-24223, **центральный склад,** общ. пл. – 673,7 кв. м, инв. № 602/С-24219, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 624450100001001028 площадью 3,7321 га по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, пер. Калинина М. И., 3 | | **567 200,00** | |
| | **Технологическое оборудование:** | | | |
| *2* | Бутылкомоечная машина АММ6, заводской № 368 | ЛР01219 | **8700,00** | |
| *3* | Транспортер ящичный | ЛР00034 | **4200,00** | |
| *4* | Транспортер для бутылок Д9-Т4 | 0001005 | **2250,00** | |
| *5* | Машина розлива плунжерная МРП-8 | ЦС00001 | **4800,00** | |
| *6* | Машина укупорочная ЛПМ4-602В.1 0,75, заводской № 24/1125/1 | ЛР01193 | **3650,00** | |
| *7* | Машина укупорочная Д9-ВАУ-2-05 07 ПЭТ, заводской № 19/306/2 | ЛР01004 | **3850,00** | |
| *8* | Инспекционная машина В6-ВИА, заводской № 75 | 0001003 | **1800,00** | |
| *9* | Автомат для наклейки акцизных марок АНМ-5 0,7, заводской № /02 р.306/1 | ЛР01006 | **2400,00** | |
| *10* | Этикетировочная машина А1-ВЭ2С-В05, заводской № 289 | ЛР01221 | **2950,00** | |
| *11* | Бутылкомоечная машина БЗ-АММ-6ПС 0,5, заводской № 454 | ЛР00035 | **4400,00** | |
| *12* | Розливной автомат Т1-ВРА-6А | ЛР01222 | **3850,00** | |
| *13* | Укупорочный автомат ЛПМ4-602В1 | ЛР01217 | **2600,00** | |
| *14* | Инспекционный автомат АИ-500 | ЛР01215 | **2700,00** | |
| *15* | Машина этикетировочная А1-ВЭ2С-БВ 0,5 с блоком наклейки акцизных марок | ЛР00100 | **3750,00** | |
| *16* | Транспортер для бутылок | ЛР00009 | **2250,00** | |
| *17* | Котел PROTERM GRIZZILY 85 KLO, заводской № 21074685KLOR12 | 0001131 | **1500,00** | |
| *18* | Котел PROTERM GRIZZILY 85 KLO, заводской № 21064385KLOR12 | 0001132 | **1500,00** | |
| *19* | Пожарная сигнализация № 2 | 0001196 | **6400,00** | |
| | **Малоценное имущество:** | | | |
| *20* | Малоценное имущество (1 190 шт.). С перечнем можно ознакомиться у организатора торгов | | **91 140,66** | |

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.
**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.
**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.**
Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:
– заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;
– для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);
– для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);
– для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);
– для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.
При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.
Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.
Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.
Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которыми можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.
Предыдущие извещения по лоту № 1 опубликованы в газете «Звязда» от 23.09.2019 и 02.10.2019.
Аукцион состоится **27.12.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.12.2019** до **16.00** по указанному адресу. Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Трест № 26 Железобетонмонтаж», г. Минск, ул. Харьковская, д. 15, 3-й этаж, тел. +375 17 256 90 09 |

**Предмет аукциона**
Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254В

| Лот № | Наименование (назначение) |
|---|---|
| 1 | Открытый склад металла № 1 (сооружение специализированное складов, хранилищ) общей площадью 10 146,7 кв. м, инвентарный номер 350/С-187388. Здание теплопункта (здание специализированное энергетики) общей площадью 42,9 кв. м, инвентарный номер 350/С-88096. Кран консольный козловой, инв. номер по бухучету 920 |

В состав лота входит иное имущество. Подробная информация на сайте организатора WWW.CPO.BY

Сведения о земельном участке: общ. пл. 1,6690 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания открытого склада металла № 1, здания теплопункта

**Начальная цена с НДС 20 %: 87 204,61 белорусского рубля (BYN)**
**Шаг аукциона: 4360,23 белорусского рубля (BYN)**

Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254Д

| Лот № | Наименование (назначение) |
|---|---|
| 2 | Канализационно-насосная станция (здание специализированное коммунального хозяйства) общей площадью 31,9 кв. м, инвентарный номер 350/С-88092 |

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,0464 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания канализационно-насосной станции

**Начальная цена с НДС 20 %: 7 296,00 белорусского рубля (BYN)**
**Шаг аукциона: 364,80 белорусского рубля (BYN)**

**Имущество, реализуемое одним лотом по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 254**

| Лот № | Наименование (назначение) |
|---|---|
| 3 | **Здание АБК с цехом по производству м/к** (здание многофункциональное) общей площадью 3 030 кв. м, инвентарный номер 350/С-88086. **Здание проходной** (здание неустановленного назначения) общей площадью 8,7 кв. м, инв. номер 350/С-187432. **Линия электропередачи** (сооружение специализированное энергетики) протяженностью 1 041,0 м, инвентарный номер 350/С-187432. Адрес: г. Гомель, линия электропередачи от П/С КПД по ул. Объездной до ТП-200 по ул. Барыкина, 254. **Линия электропередачи** (сооружение специализированное энергетики) протяженностью 1159,7 м, инвентарный номер 350/С-188234. Адрес: г. Гомель, линия электропередачи от ТП-200 по ул. Барыкина, 254 до опоры № 1. **Канализационная сеть** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения) протяженностью 388,7 м, инв. номер 350/С-188231. Адрес: г. Гомель, канализационная сеть от КК1 до здания КНС по ул. Барыкина, 254. **Дождевая канализационная сеть (сооружение специализированное коммунального хозяйства)** протяженностью 473,4 м, инвентарный номер 350/С-187428. Адрес: г. Гомель, дождевая канализационная сеть на территории производственной базы по Барыкина, 254. **Водопроводная сеть (сооружение специализированное водохозяйственного назначения)** общей площадью 1 938,0 м, инвентарный номер 350/С-187430. Адрес: г. Гомель, водопроводная сеть от ВК13 до зданий по ул. Барыкина, 254. **Тепловая сеть** (сооружение специализированное энергетики). Адрес: г. Гомель, тепловая сеть от точки врезки до здания по ул. Барыкина, 254 |

В состав лота входит следующее имущество: телефонный кабель, аппарат факсимильный – 1 шт., компьютер с монитором – 2 шт., прибор «Алкатест» – 1 шт., принтер Herox Phaser 3140 – 1 шт., принтер HP 3140 – 1 шт., рулетка 30 м – 1 шт., травокосилка 128 R 252 71 57-58 – 1 шт., штатив ШР-160 – 1 шт., эл. обогреватель маслянный – 1 шт., эл. шкаф силовой – 1 шт., бетоносмеситель СБР-260, инв. номер 42, кран-балка, инв. номер 622, эл. кран-балка подвесная, инв. номер 706, а также многолетние насаждения, в составе: ель – 1 шт., плодовая яблоня – 9 шт., ива – 3 шт., тополь – 3 шт., тополь американский – 1 шт., клен – 3 шт., рябина – 3 шт., береза – 1 шт.

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,5909 га, предоставлен продавцу на праве аренды по 20.06.2024 г. для эксплуатации и обслуживания АБК с цехом по производству м/к, проходной

**Начальная цена с НДС 20 %: 295 299,55 белорусского рубля (BYN)**
**Шаг аукциона: 14 764,98 белорусского рубля (BYN)**

**Порядок ознакомления:** Каминский Павел Иванович, ликвидатор, тел. 8029-659-14-39, Дриневский Виктор Васильевич, начальник производственного участка, тел. +375(29) 603 49 02

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** при цене продажи предмета аукциона в сумме до 49 999,99 BYN – срок оплаты не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи. При цене продажи предмета аукциона в сумме свыше 50 000,00 BYN – срок оплаты не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 23.11.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **24.12.2019** в 10.00 по адресу: **г. Минск, Бетонный проезд, 17** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **20.12.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by |

Чалавек — чалавеку

# УСПОМНІМ МЫ — УСПОМНЯЦЬ НАС

**За сваё жыццё я прачытаў мноства кніг. Люблю мастацкія, дакументальныя, навуковыя і — асобным радком — «Памяць», гістарычную хроніку, у якой звыш 150 тамоў.**

Чым яны важныя? Тым, што створаны на аснове дакументаў з дзяржаўных і асабістых архіваў, навуковых даследаванняў, публікацый, успамінаў удзельнікаў і сведак шматлікіх падзей, што адбываліся ў жыцці беларусаў, тым, што да збору і падрыхтоўкі матэрыялаў прычыніліся мясцовыя краязнаўцы, работнікі архіваў, бібліятэк, музеяў, супрацоўнікі савецкіх органаў, журналісты, навукоўцы, рэдактары.

Вельмі важна, што ў хроніках пададзены прозвішчы загінулых: франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў, мірных грамадзян — ахвяр фашысцкага тэрору. Там жа — спісы воінаў Чырвонай Арміі, пахаваных на тэрыторыі раёнаў, звесткі пра тых, хто пацярпеў ад рэпрэсій, загінуў у Афганістане. Ёсць у кнігах і матэрыялы пра славутых землякоў — герояў працы, пісьменнікаў, дзеячаў культуры, навукоўцаў...

Што важна, гэты праект пастаянна натхняе сучасных даследчыкаў на далейшыя пошукі, бо адкрываюцца некалі закрытыя архіўныя справы, з'яўляюцца новыя звесткі, даследаванні і, адпаведна, новыя імёны.

...Кажуць, што верная і дзейсная памяць падвойвае жыццё. Хочацца, каб нашы нашчадкі кіраваліся гэтымі словамі, каб звярталіся да выданняў хронікі.

**Канстанцін Карнялюк, краязнавец,**
*г. Віцебск.*

Весткі з месцаў

# КАБ АДЧУВАЦЬ СЯБЕ БЕЛАРУСАМІ...

**У нашай школе адбылося сапраўднае свята прыгожага пісьменства, на якое завітаў выдатны паэт, эсэіст, перакладчык, даследчык беларускай літаратуры, ды яшчэ і зямляк (родам з Зэльвеншчыны) Міхась Скобла.**

Сваё выступленне перад старшакласнікамі госць пачаў з захаплення велічнымі асобамі, якіх даў сусветнай культуры беларускі народ, — з нашых Васіля Быкава, Максіма Багдановіча. А далей — загучалі вершы, і трэба было бачыць, як заіскрыліся дапытлівыя вочы падлеткаў ад іх хараства і меладычнасці, ад мудрасці простых слоў, прасякнутых любоўю да роднага краю, да матухны-зямлі...

Потым старшакласнікі самі падчас гульні «Нёман нябесны» паспрабавалі шукаць адказы на праблемныя пытанні, аналізаваць і такім чынам паглыбляць свае веды не толькі па беларускай літаратуры, але і па гісторыі, геаграфіі. Вялікую цікавасць слухачоў выклікала і прэзентацыя анталогіі «Галасы з-за небакраю» — з перакладамі з 50 моў свету, 658 аўтараў, 198 перакладчыкаў...

Напрыканцы дыялогу Міхась Скобла заклікаў падлеткаў любіць свой край, у любым кутку свету адчуваць сябе беларусамі і, вядома ж, быць вартымі гэтага ганаровага звання.

**Валянціна Яткоўская, Таццяна Грэцкая, настаўніцы беларускай мовы і літаратуры СШ № 22,**
*г. Гродна.*

Вуснамі дзіцяці...

# НОВАЯ ДАРОГА ДА КІЕВА

**...Цікавая работа ў педагогаў. Вяду вось гурток па рускай мове і літаратуры — як правіла, у форме дыялогаў. Загадваю загадку: «Полон хлевец белых овец». Адгадку (рот і зубы) не ведае ніхто. Падказваю, што гэта ёсць амаль у кожнага чалавека.**

**— Мабільнік! — радасна выгуквае Максім.**

Наступны занятак прысвечаны жывой прыродзе, назвам птушак, рыб, звяроў... Пытаюся:

— Дзеці, хто такі сазан?

Данік:

— Супергерой!..

Цікава атрымалася і з вядомай прыказкай: на дошцы я напісаў: «... до Киева доведёт» і папрасіў дзяцей замест шматкроп'я ўставіць слова, гэта значыць, адказаць на пытанне: што ж давядзе да гэтага горада?

Вучні сталі думаць, перабіраць самыя розныя варыянты, але ўсё было не тое... Падказваю ім:

— Першая літара я...

І...

Ніколі б не думаў, што ад вясковага другакласніка пачую ў адказ:

— «Яндэкс»!

А яно ж і сапраўды — сённяшняя гэтая сістэма пошуку давядзе не толькі да Кіева, але і да Антарктыды...

Так што новыя часы — новыя павевы. І гэта не толькі пра дарослых, але і пра дзяцей.

**Максім Шастакоў,**
*г. Гомель.*

Людзі і лёсы

# Помніць імёны свае

## І не сцерці з памяці лічбы

**— Саўчыц Інайда Пятроўна, — пры знаёмстве прадставілася старшыня гарадской арганізацыі «Дзеці вайны».**

**— Як-як? — перапытаў я.**

**— Інайда Пятроўна, — з усмешкай паўтарыла жанчына. — Што — нечаканае імя?.. Маме яно таксама не падабалася: у царкве перахрысціла мяне на Ганначку, а ў побыце звала Інай.**

**Цётка Інайды Пятроўны — Людміла Фролаўна Цітавец, якая прысутнічала пры гэтай размове, — растлумачыла, што пляменніца нарадзілася, можна сказаць, у канцлагеры, што роды прымала немка, і яна ж выбрала імя. Парадзісе Ефрасінні Фролаўне Прылуцкай нічога не заставалася, як згадзіцца.**

### Пад фашысцкім каваным ботам

Да вайны сям'я Прылуцкіх з дзевяці чалавек жыла на хутары каля возера Белага, што ў Жыткавіцкім раёне. Прыгажосць там — вачэй не адвесці. Здавалася, толькі жыві, радуйся вольнасці, працуй ды спадзявайся на лепшае.

Такі ў людзей быў настрой, пакуль не грымнула вайна, не з'явіліся новыя гаспадары, не сталі рабаваць, расстрэльваць, вешаць... Не дзіва, што многія з палешукоў пайшлі ў партызаны.

— У полымі вайны, — расказвае Інайда Пятроўна, — загінулі мой бацька Пётр Сцяпанавіч, дзед Фрол Віктаравіч, два дзядзькі Косця і Міхал, цётка Ганна. Выжылі — бабуля Стэфаніда Бенядзіктаўна, мая мама і цёткі Людміла і Марыя, хоць якое там было жыццё, — пастаянная душэўная калатня, бо чужынцы ўвесь час лютавалі. Толькі і чуваць было, што там людзей пастралялі, там спалілі хаты, а то і цэлыя вёскі.

Да іх хутара бяда дайшла ў сакавіку 1942 года, калі на дым сышло ўсё нажытае, і Прылуцкія з пустымі торбамі пайшлі ў Жыткавічы.

Прытулак ім далі знаёмыя, а вось работы нідзе не было, таму Марыя і Франя (маці Інайды Пятроўны) уладкаваліся ў нямецкі шпіталь прыбіральшчыцамі. З тых няшчасных заробкаў сям'я і выжывала, а яшчэ — гаравала, што немцы разам з людзьмі спалілі вёскі Дзякавічы, Поўчын...

Лютуючы і ў адказ на рашучае наступленне Чырвонай Арміі, 20 чэрвеня 1944-га яны ўжо ў райцэнтры спехам сагналі людзей у калоны, пад брэх аўчарак пагрузілі ў таварняк. За марудлівасць цяжарную Франю Прылуцкую адзін з фрыцаў агрэў бізуном, ды так, што яна ледзь утрымалася на нагах і потым доўга кульгала.

### Канцлагер КІС

— На пачатак вайны мне было адзінаццаць гадоў, — згадвае цётка Інайды Пятроўны Людміла Фролаўна, — і я добра ўсё памятаю. Праз трое сутак мы апынуліся ў горадзе Штутгарце-Гедэльфінген у канцлагеры КІС. Там было шмат баракаў на 30-40 чалавек — з трох'ярусными нарамі і адным умывальнікам. Кожны з нявольнікаў атрымаў драўляныя калодкі (на ногі) і паласатую робу з надпісам OST. Прозвішчы-імёны ўсіх былі занесены ў спецыяльны журнал, а людзям прысвоены нумары. У мамы ён быў 1797, у мяне — 1798... Карыстацца сваімі імёнамі катэгарычна забаранялася.

Лагер быў абнесены калючым дротам. На вышках — узброеныя ахоўнікі. Многія з іх былі з захопленых тэрыторый Польшчы, Украіны, Расіі і лютавалі ў бараках куды горш, чым немцы: выслугоўваліся, збівалі без дай прычыны...

А працавалі вязні на заводзе, у дзве змены, па 12 гадзін. І гэта — пасля кубка чорнай кавы без цукру на снеданне і чарпака баланды ў абед... Кожную раніцу і вечар на пляцы, у любое надвор'е, праводзілі пераклічку, высвятлялі прычыны адсутнасці таго ці іншага нумара (хворых і памерлых было шмат). У выніку вязні маглі доўга стаяць пад дажджом ці снегам, потым — у мокрым адзенні — падалі спаць ці ішлі на работу.

— Мама расказвала, — зноў уступае ў размову Інайда Пятроўна, — што побач з заводам за калючым дротам трымалі палонных французаў, палякаў, югаславаў. Ім было трохі лягчэй, бо прыходзіла хай невялікая, але ж гуманітарная дапамога па лініі Чырвонага Крыжа... Нашых ваеннапалонных трымалі асобна і — літаральна — марылі голадам. Адзін з нявольнікаў, калі іх пераганялі ў іншае месца, пацягнуўся, каб сарваць гронку вінаграду... Яго прашылі аўтаматнай чаргой і пакінулі вісець на агароджы.



Вязень канцлагера Ефрасіння Фролаўна ПРЫЛУЦКАЯ. 1944 год.

— Вашу маму як цяжарную, магчыма, вызвалялі ад цяжкай працы? — пытаю Інайду Пятроўну.

— Не, што вы! Яна ўкалвала нароўні з іншымі! І гэта яшчэ нічога, бо яе ганялі на завод і калі нарадзіла... Я ж, маленечкая, заставалася ў бараку адна, без догляду, і мама вельмі баялася, што калі буду плакаць, то мяне проста заб'юць... На шчасце, я была спакойная: нікому не перашкаджала. Тым не менш маму не пакідала трывога, і яна нейкім чынам пранікла ў кабінет да начальніка канцлагера (што вязням катэгарычна забаранялася), папрасіла пакінуць яе прыбіральшчыцай тэрыторыі. Як ні дзіўна, той пайшоў насустрач, і мама потым малілася за ягонае добрае сэрца.

— А як атрымалася, што роды ў яе прымала фрау?

— Мама казала, што ў лагер іншым разам прыходзілі месцічы, каб з ліку вязняў выбраць сабе парабкаў, памочнікаў па гаспадарцы. У мамы быў вялікі жывот, але тая немка ўзяла яе ў свой дом. Магчыма, з чыста прафесійнага інтарэсу (фрау была ўрач-гінеколаг), магчыма, з чыста жаночай салідарнасці альбо і спагады, бо потым тая ж немка забяспечвала маму пялюшкамі і,


Інайда Пятроўна САЎЧЫЦ.

нанач адпраўляючы ў лагер, прывязвала ёй пад пахі штосьці з прадуктаў... Тым самым, як і начальнік лагера, яна рызыкавала сваім жыццём.

### Дома і салома ядома...

Вязняў канцлагера КІС вызвалілі амерыканцы. Яны прапаноўвалі ім пасяліцца ў Штатах альбо ў нейкай іншай краіне, галоўнае — не вяртацца ў сваю, бо там разруха і голад. Але Прылуцкія, як і абсалютная большасць грамадзян былога Савецкага Саюза, верылі, што дома і салома ядома, а чужына і ёсць чужына...

Калі б яны ведалі, што іх чакае на радзіме, то ніколі не вярнуліся б. Іх, учарашніх нявольнікаў, прывезлі ў Мазыр, а далей (часам за сотні кіламетраў) кожны дабіраўся як мог, прычым на спагаду зусім не разлічваў. Хутчэй, наадварот: іх сустракалі варожа, бо яны, маўляў, «працавалі на немцаў».

У Жыткавічах, адкуль вывозілі ў лагер, Прылуцкім адмовілі ў прапісцы. Учацвярых (старая хворая маці, дзве сястры і маленькае дзіця) яны прайшлі яшчэ 30 кіламетраў да свайго папялішча. Ні блізкіх, ні родных, ні жытла, ні работы там не было, улады адвярнуліся...

— Мая мама, — кажа Інайда Пятроўна, — пражыла доўгае і цяжкае жыццё, памерла летась у няпоўных 96 гадоў. Яна была вельмі моцная жанчына, умела і рабіла ўсё: сама пабудавала зямлянку з печкай, у якой жылі аж восем гадоў, потым — хаціну. Сеяла, жала, шыла, ткала, дапамагала ўсім: калі яна клалася спаць, я ніколі не бачыла.

...Удзячная ёй дачка, скончыла школу рабочай моладзі, атрымала спецыяльнасць, выйшла замуж, нарадзіла двух дзяцей, працавала. У 2008 годзе па запрашэнні царкоўнай абшчыны наведала Германію, выступала перад навучэнцамі школ і каледжаў.

Адзін з хлопцаў тады спытаў: як пасля ўсяго перажытага былыя вязні ставяцца да немцаў іх нацыі? Яна сказала: што было, тое было і сышло ў гісторыю, якую трэба ведаць і помніць. Што да беларусаў, то ў іх няма нянавісці да нямецкай нацыі: так, у Германіі былі фашысты, аднак былі і спагадлівыя, чулыя людзі. Як і ў Беларусі: хапала патрыётаў, але ж сустракаліся і здраднікі... Галоўнае цяпер — жыць у міры, дапамагаць адно аднаму, сябраваць: не дапускаць, каб жахі мінулай вайны паўтарыліся.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**
**Фота Дзмітрыя ЧАРНЯЎСКАГА.**
**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

Імёны

# Наталля БІБІКАВА: «Мае заўсёдныя спадарожнікі — тэатр і тэлебачанне»



**НЯВАЖНА, пастаноўкі прэм'ерныя ці даўно прызнаныя, сцэны вялікія ці камерныя, калектывы сталічныя ці рэгіянальныя — для аўтара і рэжысёра праграм «Тэатр у дэталях», «100 дзён з Купалаўскім» Наталлі Бібікавай слушная толькі адна акалічнасць: «таленавіта». Стаць удзельнікам праектаў — нагода для гонару. Стаць гледачом — задавальненне. На журналісцкае шчасце, і на здымачнай пляцоўцы бываюць паўзы: Наталля знайшла час для інтэрв'ю і падзялілася думкамі пра сваіх заўсёдных спадарожнікаў — тэатр і тэлебачанне.**

***— Яшчэ да запуску аўтарскіх праграм вы працавалі над рубрыкай «Сцэна» ў перадачы «Добрай раніцы, Беларусь!». Чым адметная была гэта работа?***

— Першапачаткова я прыйшла туды ў якасці асістэнта рэжысёра: рыхтавала запісы да эфіру, часам удзельнічала ў здымках — даручэнні былі розныя. І вось аднойчы паўстала патрэба ў сюжэце аб прэм'ернай пастаноўцы Валерыя Анісенкі «Жанчыны Бергмана» ў Тэатры беларускай драматургіі. Мне захацелася паспрабаваць. На шчасце, кіраўніцтва ўпадабала маю работу, і хутка было прынята рашэнне адкрыць рубрыку «Сцэна». У эфір я выходзіла штодня — а значыць, кожны дзень мусіла знайсці тэму і зняць ролік. Канцэрты, фестывалі, гастролі і, безумоўна, спектаклі — нішто не праходзіла міма нас. І такі шчыльны графік — на працягу васямнаццаці гадоў... За гэты час вызначыла для сябе правіла: не грэбаваць аніякай, нават самай дробнай працай.

***— Варта сказаць, што па адукацыі вы актрыса і асновы тэлевытворчасці асвойвалі самастойна...***

— Я перакананa, што чалавек можа навучыцца чаму заўгодна, асабліва ў наш неверагодна багаты на рэсурсы час. Выступаючы ў якасці вядучай, доўга назірала, як шчыруе ўся здымачная каманда, старалася «злавіць» нюансы апаратарскай работы, мантажу. Цяпер у мяне ёсць магчымасць увасабляць праекты згодна са сваімі патрабаваннямі і густам: тэксты для перадач пішу сама, рэжысірую і манціру таксама самастойна.

***— Ведаю, што студэнтам творчых факультэтаў вашу праграму «Тэатр у дэталях» прыводзяць як прыклад якаснага арт-праекта. А ці ёсць у вас так званы must see спіс перадач пра культуру?***

— У дзяцінстве, яшчэ не ведаючы, што ў будучыні гэта будзе маёй прафесіяй, я проста абажала перадачы пра акцёраў: з захапленнем глядзела, як збіраюцца трупы легендарных тэатраў, як артысты паводзяць сябе, пра што гутараць, жартуюць, задаюць пытанні... Алег Яфрэмаў, Марк Захараў, Аляксандр Калягін — героі майго маленства. А якія цудоўныя канцэртныя нумары рыхтавалі Андрэй Міронаў, Аляксандр Шырвінт, Міхаіл Дзяржавін! Думаю, і сёння можна знайсці тыя запісы ў сеціве. А цяпер я з задавальненнем гляджу праект «Вялікая опера» і праграму-інтэрв'ю «Галоўны герой».

***— У жніўні вы пачалі работу над праектам «100 дзён з Купалаўскім», які прысвечаны сотаму сезону і надыходзячаму стагоддзю Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Якімі ўражаннямі ўжо можаце падзяліцца?***

— Ідэя ўзнікла летась. Першапачаткова планавалася падрыхтаваць перадачу пра гісторыю Купалаўскага, але ў выніку вырашылі зрабіць праграму пра сённяшнюю дзейнасць тэатра, хоць напярэдадні стагоддзя, якое адзначым у наступным верасні, гістарычныя агляды таксама выйдуць у свет.

**«Нам хочацца скараціць адлегласць паміж купалаўцамі і гледачамі, паказаць новыя бакі тэатральнага жыцця».**

А цяпер нам важна як мага падрабязней расказаць прыхільнікам пра тэатральныя будні — пра ўсё, што звычайна схавана. Нам хочацца скараціць адлегласць паміж купалаўцамі і гледачамі, паказаць новыя бакі тэатральнага жыцця. Мне ўсцешна, што атрымалася зняць збор трупы пасля адпачынку. А цяпер, калі сезон распачаўся, здымачная каманда прысутнічае на сходах, на святкаваннях, на рэпетыцыях, на чытках. Часам мы праводзім у тэатры літаральна цэлы дзень.

***— Ведаю, што над праектам працуе і Аляксандра Бабкова — ваша дачка...***

— Яна ўжо мае адукацыю тэлерэжысёра. З дзяцінства была разам са мной на здымках і назірала за ўсім працэсам стварэння. Памятаю, калі дачцэ споўнілася дванаццаць, яна атрымала ў падарунак сваю першую камеру, і з таго часу Саша стала галоўным відэографам у школе. У адзінаццатым класе зразумела, што тэлебачанне — яе лёс, таму і паступіла ў Акадэмію мастацтваў. Ведаеце, цяпер яна ўжо мой настаўнік. Заўсёды прыслухоўваюся да яе парад: на якія пастаноўкі звярнуць асаблівую ўвагу, як лепей зняць, на чым зрабіць акцэнт. Акрамя ўдзелу ў маіх перадачах, яна займаецца рэжысурай праектаў «Майстэрня», «Дом, дзе жыве мастацтва», а нядаўна адбылася прэм'ера праекта «На вышыні»: праграма расказвае пра творчую моладзь Беларусі, і Аляксандра з'яўляецца рэжысёрам-пастаноўшчыкам.

***— Пастаноўшчыкі, артысты, гледачы... Вы назіраеце за імі ўсё жыццё. Што ў тэатральным асяроддзі вас найбольш засмучае?***

— Мне вельмі балюча бачыць адвечную барацьбу класікі і эксперымента. Чаму б нарэшце старэйшаму пакаленню не зацікавіцца маладзёжнымі знаходкамі, а моладзі не прыняць класічныя пастаноўкі? Тэатр — ён розны, месца ў ім хопіць кожнаму. А вось што датычыцца гледачоў... Я мноства разоў бачыла вельмі непрыгожую рэч: ідзе спектакль — і, здаецца, усё цудоўна. Акцёры шыкоўна іграюць, «выкладваюцца» напоўніцу. Глядач рэагуе — смяецца, плача, усміхаецца. Артысты выходзяць на паклон — і бачаць павернутыя спіны некаторых гледачоў, якія бягуць заняць чаргу ў гардэробе. Калі ласка, не спяшайцеся сыходзіць. Не шкадуйце ўдзячнасці тым, хто цэлы вечар дарыў вам сваю энергію.

***— І напрыканцы — крыху прыемнасцяў. Як мама чатырохгадовага Максіма, на якія пастаноўкі для дзяцей у сёлетнім тэатральным сезоне вы раіце звярнуць увагу?***

— Зусім нядаўна ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек адбылася цудоўная прэм'ера спектакля «Тута Карлсан: першая і адзіная», пастаўленага Кацярынай Ложкінай-Бялевіч. Вельмі разумная і ў той жа час лёгкая, захапляльная работа. А яшчэ мне вельмі падабаецца незалежны дзіцячы тэатр Златы і Уладзіміра Глотавых, які называецца «Пацеркі». Удалы літаратурны матэрыял, найпрыгажэйшыя хэнд-мэйд дэкарацыі і, што галоўнае, увага да маленькіх гледачоў, разуменне іх настрою і чаканняў. Абавязкова пазнаёмцеся!

**Марыя СТРАХ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# «ШаноVныя гісторыі»: пераадолеем адзіноту разам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хтосьці з людзей срэбранага ўзросту знаходзіць сваё суцяшэнне ў актыўнай сацыяльнай дзейнасці. Яны наведваюць клубы і гурткі пры ТЦСАН, ходзяць на канцэрты, становяцца валанцёрамі. Але ёсць тыя, каму ўжо цяжка перасоўвацца, хто мае патрэбу ў дапамозе іншых людзей. **Алена БАГДАНОВІЧ, загадчыца аддзялення сацыяльнай адаптацыі і рэабілітацыі ТЦСАН Цэнтральнага раёна Гомеля**, па родзе сваёй дзейнасці сутыкаецца найбольш менавіта з такімі сталымі людзьмі. «Сярод нашых падапечных — а ў нас на надомным абслугоўванні знаходзяцца 250 пажылых людзей — вельмі шмат старых з цікавым і часта трагічным жыццём, — кажа яна. — Многія з іх — дзеці вайны, шмат хто сам прайшоў праз вайну, праз генацыд яўрэяў... Але ім часта проста няма каму расказаць пра сваё жыццё».

Большасць з падапечных яе аддзялення ўпэўнены, што яны нікому не цікавыя. «Што мне расказваць пра сябе? У маім жыцці нічога цікавага няма», — нярэдка чула яна. Але калі людзі ўсё ж пачыналі апавядаць пра сябе, то аказвалася, што гэта настолькі жывыя і глыбокія гісторыі, што іх можна было слухаць гадзінамі. «Людзі вельмі розныя, — кажа Алена Багдановіч. — Хтосьці скардзіцца на лёс, плача. А другі стараецца глядзець на падзеі свайго жыцця з гумарам, знаходзіць ва ўсім пазітыўны бок. Ёсць пары, якія ўжо 50 і больш гадоў разам. Як ім гэта ўдалося? Гэта ж бясцэнны чалавечы вопыт, які быў бы карысны шмат каму. Многія жанчыны да гэтага часу захоўваюць старыя паштоўкі, фатаграфіі, свае атэстаты сталасці... Гэта ўжо самыя сапраўдныя рэліквіі».



Ніна Сямёнаўна САЛАДОЎНІКАВА.

* * *

Вось, напрыклад, Ніна Сямёнаўна Саладоўнікава. Ёй 90 гадоў, на надомным сацыяльным абслугоўванні ў ТЦСАН ужо больш за сем гадоў. Удастоена мноства ўзнагарод за сваю працоўную педагагічную дзейнасць (больш за дзевяць ганаровых грамат, медаль «Ветэран працы» і шмат іншага). Ёсць граматы Вярхоўнага Савета БССР за 1965 і 1989 гады. Да гэтага часу захоўвае звесткі пра сваю школьную паспяховасць (амаль усюды «выдатна»), кнігу «Дзіцячыя гады Ільіча» — падарунак пасля заканчэння 1 класа. Сама больш за 35 гадоў аддала педагогіцы. У пачатку 1941 года яе маці-медсястру прызвалі на фронт, тая ўзяла дачку з сабой. Усе выпрабаванні прайшлі разам, потым аднаўлялі свой горад... Цяпер Ніна Сямёнаўна адна: яна ўдава, дзяцей не было. Увесь свой час аддавала вучням, да гэтага часу памятае іх імёны.

Ці вось таксама педагог — Лілія Іванаўна Ярмоленка, 81 год. Усё ўмела рабіць, майстар на ўсе рукі. Цяпер цяжка рукамі нешта рабіць. Адзінокая, сын памёр. Заўсёды ўспамінае толькі добрае. Парады маладым ад яе: жаніцца толькі па каханні, шанаваць сумленнасць і годнасць, вучыцца радавацца кожнаму пражытаму дню.

Або Марыя Карпаўна Лук'янава, 90 гадоў. У пачатку вайны ёй было ўсяго 12. Цяжкі лёс, але ўсё роўна яна аптыміст, да гэтага часу выдатная памяць...

* * *

Цяпер Алена Багдановіч знаходзіцца ў дэкрэтным адпачынку, але тым не менш загарэлася ідэяй захаваць усе гэтыя звесткі, выдаўшы брашуру з аўтабіяграфічнымі апавяданнямі пажылых людзей. Так з'явіўся на свет сацыяльны праект ТЦСАН Цэнтральнага раёна Гомеля «ШаноVныя», які зараз удзельнічае ў найбуйнейшым конкурсе Social Weekend.

Сутнасць яго ў тым, што адзінокія пажылыя людзі будуць прыцягвацца да напісання сваіх аўтабіяграфічных апавяданняў, і з дапамогай валанцёраў, якіх мяркуюць знайсці сярод студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, створаць твор «ШаноVныя гісторыі».

**Галоўная задача праекта — паказаць людзям сталага веку, што яны важныя, што іх жыццё каштоўнае і вопыт можа быць карысны маладому пакаленню.**

«У нас ужо ёсць восем гісторый, а ў цэлым мы плануем, што іх будзе не менш за 30, — кажа наша суразмоўніца. — Яны будуць суправаджацца фатаграфіямі з сямейных архіваў, памятнымі паштоўкамі і г. д., мы будзем распытваць людзей, чым яны ганарацца, і пісаць пра гэта».

У ідэале — плануецца стварыць пісьменніцкую студыю, на заняткі ў якую будуць прыходзіць спецыялісты-літаратуразнаўцы, валанцёры. Галоўная задача праекта — паказаць людзям сталага веку, што яны важныя, што іх жыццё каштоўнае і вопыт можа быць карысны маладому пакаленню.

А ў далейшым у аўтараў праекта ёсць задумка распрацаваць інтэрактыўныя заняткі для падлеткаў, дадаючы да аўтабіяграфічных звестак іх падапечных гістарычныя даведкі, якія будуць супадаць з пераломнымі момантамі жыцця людзей сталага веку.

**Святлана БУСЬКО.**

Скажыце, доктар...

# СПРАВЫ САРДЭЧНЫЯ

## Што такое «ціхі» інфаркт, і каму ён пагражае

**Нам здаецца, што прыкметы інфаркту настолькі яўныя, што іх немагчыма не заўважыць. Класічнае апісанне стану пры гэтай сардэчна-сасудзістай катастрофе ўключае ціск за грудзінай, які перарастае ў моцны боль, і пачуццё страху. Але так бывае не заўсёды. Інфаркт міякарда здараецца, калі кроваток да сардэчнай мышцы рэзка скарачаецца ў выніку закупоркі каранарнай артэрыі тромбам. Але ў некаторых выпадках людзі не адчуваюць болю, нягледзячы на тое, што адбываецца ў іх арганізме, таму не звяртаюцца па дапамогу і губляюць каштоўны час. Як распазнаць «ціхі» інфаркт, ці можна яго не заўважыць увогуле і якія наступствы ён тоіць, расказала загадчык аддзялення Фрунзенскага раённага кардыялагічнага цэнтра (на базе 31-й гарадской паліклінікі Мінска) Наталля КАРПУК.**

***— Наталля Пятроўна, растлумачце, што такое «ціхі» інфаркт.***

— Сапраўды ёсць атыповыя формы інфаркту міякарда, якія можна аднесці да «ціхіх» інфарктаў. Яны працякаюць без яўнага болевага сіндрому ў вобласці сэрца. Напрыклад, хворы адчувае боль у верхняй частцы жывата, з'яўляецца пякотка. І часта чалавек або не звяртае ўвагі на гэтыя сімптомы, або самастойна аказвае сабе дапамогу, мяркуючы, што гэта атручванне ці іншыя праблемы са страўнікам. А так можа працякаць абдамінальная форма інфаркту. Калі здараецца рэзкае зніжэнне ціску і страта прытомнасці, так можа праяўляць сябе яшчэ адна форма — калаптоідная. А пацыенты спісваюць гэта на неўралагічныя хваробы і звяртаюцца да неўролага. Хворыя на цукровы дыябет, у якіх першапачаткова зніжаны болевы парог, таксама часам не адчуваюць болю. У іх з'яўляецца нарастанне задышкі або парушэнне рытму, якіх раней не было, і гэта могуць быць праявы інфаркту. Яшчэ адна форма перыферычнага інфаркту — калі пацыенту баляць ніжняя сківіца і зубы. У такіх выпадках, як правіла, ідуць да стаматолага.

***— Значыць, інфаркт можна і не заўважыць?***

— Так, калі ён маскіруецца пад іншыя хваробы. Напрыклад, пры нарастанні задышкі некаторыя пацыенты думаюць, што гэта прыступ бранхіяльнай астмы, калі ёсць такая спадарожная паталогія. А гэта страчаны час.

***— Атрымліваецца, што хваробу можна перанесці і не ведаць пра гэта?***

— Усё залежыць ад рэзервовых магчымасцяў арганізма. Сапраўды, пацыент можа даведацца, што ён перанёс на нагах інфаркт, толькі падчас абследавання праз нейкі час.

***— Гэта можна вызначыць па кардыяграме?***

— Так. Таксама па УГД сэрца, гэта адзначаецца як зніжэнне скарачальнай магчымасці. Калі ж узрост і рэзервовыя магчымасці арганізма пацыента і спадарожныя паталогіі не дазваляюць кампенсаваць гэту сітуацыю, то людзі рана ці позна звяртаюцца да кардыёлагаў ці ўрачоў іншых спецыяльнасцяў, але таксама калі каштоўны час страчаны.

***— На якія трывожныя сімптомы варта звярнуць увагу?***

— Не трэба займацца самалячэннем, асабліва калі гэта датычыцца абдамінальных формаў інфаркту. Пры болі ў жываце, асабліва працяглым, лепш звярнуцца да доктара і зрабіць ЭКГ. Калі з'яўляецца ні з чым не звязаная задышка і яна нарастае пры самай нязначнай нагрузцы, таксама трэба звяртацца да ўрача. Тое самае пры непераноснасці фізічных нагрузак — калі работа, якая раней выконвалася лёгка, цяпер патрабуе вялікіх намаганняў. Калі ў вас цукровы дыябет, то перабоі ў рабоце сэрца не варта спісваць на іншыя станы, лепш лішні раз зрабіць ЭКГ і наведаць урача.



***— Хто часцей пакутуе на нестандартныя формы інфаркту — мужчыны ці жанчыны?***

— Калі ўлічыць, што ў жанчын болевы парог вышэйшы і яны больш схільныя цярпець боль, чым мужчыны, то перанесеных атыповых формаў інфаркту ў жанчын, бадай, больш.

***— Якія фактары рызыкі ўзнікнення гэтага захворвання?***

— Такія паталогіі, як цукровы дыябет, артэрыяльная гіпертэнзія, асабліва некантралюемая. Таму ні ў якім выпадку пры лячэнні артэрыяльнай гіпертэнзіі не варта перапыняць прыём гіпатэнзіўных прэпаратаў. На сённяшні дзень толькі 30 % пацыентаў строга прытрымліваецца рэкамендацый урача і пастаянна прымаюць такія сродкі. Часам так здараецца, што хвораму, у якога з'явіліся эпізоды павышэння ціску, доктар прызначае тэрапію, а праз нейкі час пацыент вырашае, што ён здаровы, бо ціск у норме, і перастае прымаць лекі. Пэўны час працуе тая канцэнтрацыя прэпаратаў, якія назапасіліся ў арганізме. А потым пры стрэсавай сітуацыі,ператомленасці ўзнікае гіпертанічны крыз, і на яго фоне — ускладненне. Таму я пацыентам кажу: вы пры любых абставінах не павінны перапыняць лячэнне. Безумоўна, да фактараў рызыкі ўзнікнення інфаркту міякарда адносяцца гіпадынамія, лішняя вага. Пры жаданні можна знізіць масу цела, рабіць штодзённыя прагулкі. Прычым фізічная нагрузка павінна быць пастаянная. Прычыны рызык — у нашай ляноце.

***— Якія наступствы ад таго, што «ціхі» інфаркт пераносіцца на нагах?***

— Найперш трэба сказаць, што сам інфаркт — гэта цяжкае наступства ішэмічнай хваробы сэрца. Значыць, хвароба не атрымлівала адэкватнага лячэння. Пры належным стаўленні да свайго здароўя і рэкамендацый урача яго можна пазбегнуць. Што датычыцца позняга звароту з самім інфарктам, то такіх пацыентаў складаней лячыць: арганізм уключае працэсы прыстасавання і кампенсацыі, і яго работа перабудоўваецца, мяняецца структура сэрца. У любым выпадку прасцей прадухіліць хваробу, чым яе лячыць.

***— Якія яшчэ меры прафілактыкі можна параіць?***

— Сачыць за сваім ціскам. Нават калі вы цалкам здаровы, раз на год трэба паказвацца ўрачу, здаваць агульнаклінічныя аналізы, каб не ўпусціць час і не лячыць пасля наступствы свайго захворвання.

Добрыя сябры

## Шчодры аўторак пачынаецца... з панядзелка

### Сто падапечных дзіцячага хоспіса запрасілі на кінапаказ

**У панядзелак, 9 снежня, у кінатэатры Silver Screen у сталічным ТРЦ «Дана Мол» упершыню адбыўся закрыты паказ сямейнага мультфільма «Халоднае сэрца-2» для 100 сем'яў падапечных Беларускага дзіцячага хоспіса.**




Дзеці-інваліды, а таксама маладыя дарослыя, якія маюць невылечныя хваробы, пабывалі ў адным з самых новых і сучасных кінатэатраў сталіцы і атрымалі асалоду не толькі ад прагляду мультфільма, але і ад сустрэчы з добрымі сябрамі.

Паказ прайшоў у межах Міжнароднай дабрачыннай акцыі «Шчодры аўторак» (глабальны дзень добрых спраў, калі сусветная грамадскасць аб'ядноўваецца вакол ідэалаў шчодрасці і ўзаемадапамогі), якая ўпершыню сёлета падтрымана і ў Беларусі. А сетка кінатэатраў Silver Screen стала партнёрам Беларускага дзіцячага хоспіса.

Увага!

## НЕ ПРАГЛЫНУЦЬ НЕБЯСПЕЧНАЕ

**Акцыя па прафілактыцы праглынання дробных прадметаў дзецьмі дашкольнага ўзросту «Скарбонка здароўя» адбылася ўчора на базе 6-й дзіцячай клінічнай паліклінікі ў Мінску.**

Падчас прыёму педыятраў бацькам і дзецям расказалі пра зоны даступнасці дробных прадметаў і спосабы іх выяўлення. Малым уручылі «свінкі-скарбонкі» як альтэрнатыву для захоўвання дробных прадметаў, а бацькі атрымалі рэкамендацыі па абыходжанні з небяспечнымі рэчамі.



Мерапрыемства прайшло ў межах праекта «Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, прасоўванне здаровага спосабу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь» (БЕЛМЕД), які фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца ПРААН, СААЗ, ЮНІСЕФ і ЮНФПА ў партнёрстве з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел супрацоўнікі Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. Мэта акцыі — прыцягнуць увагу да праблемы праглынання дробных прадметаў дзецьмі.

А вы ведалі?

## ШКОДНЫЯ ТАБЛЕТКІ

### 3 аптэк адазваны некаторыя лекі ад язвы страўніка

**З аптэк Беларусі адазваны прэпараты, якія ўтрымліваюць раніцыдзін. Гэта таблеткі раніцыдзін-акос і ранігаст. Яны выкарыстоўваюцца для лячэння язвы страўніка і іншых хваравітых станаў. Пра гэта паведамляе Рэспубліканскі цэнтр экспертыз і выпрабаванняў у сістэме аховы здароўя.**

Раней Еўрапейскае медыцынскае агенцтва і Упраўленне па кантролі прадуктаў харчавання і лекавых сродкаў ЗША ініцыявалі ацэнку прэпаратаў, якія ўтрымліваюць рэчыва раніцыдзін. Іх цікавіла, ці ёсць там канцэрагенныя прымесі, бо ў невялікай колькасці там ужо знайшлі N-нітразадыметыламін. Гэтае злучэнне (па-іншаму NDMA) пасля даследавання на жывёлах класіфікуецца як «злучэнне з магчымымі канцэрагеннымі ўласцівасцямі». Прымесь сустракаецца ў некаторых прадуктах і вадзе, хоць, паводле пэўных звестак, не нясе шкоды пры прыёме ўнутр у невялікай колькасці.

У цэлым раніцыдзін падаўляе секрэцыю салянай кіслаты і выкарыстоўваецца для лячэння і прафілактыкі язвавай хваробы страўніка, дванаццаціперснай кішкі, рэфлюксэзафагіту і іншых хвароб.

Цяпер ініцыявана добраахвотнае прэвентыўнае адкліканне з беларускага рынку такіх прэпаратаў ад двух вытворцаў — Курганскага таварыства медпрэпаратаў і вырабаў «Сінтэз» (Расія) і Pharmaceutical Works POLPHARMA S. A. (Польшча). Гэта таблеткі раніцыдзін-акос і ранігаст.

«З прычыны адсутнасці сёння на тэрыторыі Беларусі іншых пастаўшчыкоў лекавых сродкаў, якія ўтрымліваюць раніцыдзін у таблетаванай форме, часова рэкамендуецца пры новых прызначэннях выкарыстоўваць альтэрнатыўную тэрапію — фамацыдзін ці прэпараты групы інгібітараў пратоннай помпы», — растлумачылі ў Цэнтры экспертыз.

Для прызначэння альтэрнатыўнай тэрапіі варта звярнуцца да ўрача.

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## Брагинский районный исполнительный комитет извещает о проведении аукционов на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания торгового объекта

Примечание

1. Заявление и прилагаемые к нему документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. п. Брагин, пл. Ленина, 3, отдел землеустройства Брагинского райисполкома с первого дня после публикации извещения в СМИ в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Информация о земельных участках по контактному телефону в г. п. Брагин (8-02344) 39066.

2. Для участия в аукционе необходимо представить: заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка; заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет (сумма задатка перечисляется в срок не позднее двух дней до проведения аукциона)

3. Кроме того, в комиссию представляются: юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

– индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и копия паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – паспорт и нотариально удостоверенная доверенность.

4. Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

– в течение десяти рабочих дней внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка;

– в течение двух рабочих дней после совершения вышеуказанных действий заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после заключения договора аренды земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок;

– получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

– приступить к строительству объекта в течение шести месяцев с момента возникновения права на земельный участок;

– завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией;

– снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации.

5. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов за лот наивысшую цену.

6. Брагинский районный исполнительный комитет вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до назначения даты его проведения.

| | |
|---|---|
| **Место расположение земельного участка и кадастровый номер** | Гомельская область, Брагинский район, г. п. Комарин, ул. Ленина В. И., 67, 320382890601000357 |
| **Номер лота** | 1 |
| **Целевое назначение земельного участка, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений** | Земельный участок для строительства и обслуживания торгового объекта |
| **Площадь земельного участка** | 0,0900 га |
| **Сведения об участке (расстояние до железной, автомобильной дороги, ограничения в использовании, наличие коммуникаций)** | Примыкает к асфальтированной проезжей части улицы; вблизи уличной воздушной линии электропередачи, расстояние до железной дороги приблизительно 5 км. Введены ограничения в использовании земельного участка: в связи с его расположением на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению в результате катастрофы на Чернобыльской АЭС (зона с правом на отселение), в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (линий связи и радиофикации, электрических сетей, на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохраной зоне реки, водоема)) |
| **Срок аренды земельного участка** | 50 лет |
| **Начальная цена предмета аукциона, бел. руб.** | 3113 рубля |
| **Сумма задатка, белорусских рублей** | 350 белорусских рублей р/с BY03AKBB36424110000313000000 в ЦБУ 306 филиала № 300 Гомельского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. п. Брагин, БИК AKBBBY21300 УНП 400032670, код платежа 04002 получатель – Брагинский райисполком |
| **Дата и время проведения аукциона** | 15 января 2020 г., 16.00 |
| **Последний день приема заявлений** | 13 января 2020 г. до 16.00 |
| **Место проведения аукциона** | В зале заседаний Брагинского райисполкома по адресу: г. п. Брагин, пл. Ленина, 4 |
| **Затраты на подготовку документации, белорусских рублей** | Расходы в сумме 1609 рублей 56 копеек на р/с BY48AKBB36004110000110000000, ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 400555165, получатель – ГУ МФ РБ по Гомельской области, код платежа 04616. Кроме того, расходы по размещению в СМИ извещения о проведении аукциона |

## О реализации на повторном аукционе имущества УП «ТРАКТРАНССЕРВИС».

Организатор: ИП О. Н. Домакур (8029-6717173). Продавец – УП «ТРАКТРАНССЕРВИС». 30.12.2019 в 10.20 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15. Лоты: 1. LAND-ROVER RANGE-ROVER г/н 9396НА-7 – 22 896 руб. 2. VOLKSWAGEN TOUAREG г/н 9617OK-7 – 5473,35 руб. Нач. цена – выше. Победителем признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Задаток возвращается в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола. Результаты оглашаются в день проведения торгов. Если торги признаны несостоявшимися (заявление подано одним участником), предмет продается по цене, увеличенной на 5 %. Шаг торгов – 5 %. Заявки принимаются до 26.12.2019 (10.00). Задаток перечисляется (10 % от нач. цены) на счет BY40UNBS30120694300070000933 (ЗАО «БСБ Банк»). Желающие подают заявление на участие в торгах с приложением документов. Возможно снятие имущества с торгов не позднее чем за пять дней до их проведения. Затраты возмещаются победителем (подробно – **bankrot.gov.by**).

# И З В Е Щ Е Н И Е
## о проведении 23 января 2020 г. аукциона по продаже изъятого по Указу Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 г. № 87 не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома и в частную собственность земельного участка, на котором расположен предмет аукциона, в Мухавецком сельском Совете Брестского района Брестской области

| № лота | Местоположение не завершенного строительством незаконсервированного жилого дома | Характеристика объекта оценки | Начальная (стартовая) стоимость объекта (бел. руб.) | Сумма задатка, бел. руб. | Возмещение расходов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестский район, д. Подлесье-Каменецкое | Не завершенный строительством незаконсервированный жилой дом в виде капитального строения (фундамента) площадь застройки – 119 кв. м, готовность 5 %, составные части и принадлежности: сарай, расположенный на земельном участке с кадастровым номером 121283306101000103 площадью 0,0973 га для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 4 735,86, в том числе: 2111,83 – начальная цена не завершенного строительством жилого дома 2422,77 – начальная цена земельного участка. 201,26 – сумма расходов на оценку стоимости не завершенного строительством жилого дома | 480,00 | 1. Государственная регистрация прекращения права собственности на земельный участок – 76,50 руб. 2. Объявления – согласно актам выполненных работ |

Электрофикация за счет собственных средств (строительство двух опор), проезд к участку по существующей уличной сети.
Аукцион будет проводиться 23 января 2020 г. в 10.00 по адресу: Брестский район, аг. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21 (в здании сельисполкома).
Для участия в аукционе необходимо подать заявление и предоставить копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Мухавецкого сельисполкома **BY 09 AKBB 3641 0000 0025 9100 0000, в филиале № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AK BBBY 21100, УНП 200087296, код платежа 4901, суммы задатка в размере 10 %** от начальной цены земельного участка, а также документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.
Для проведения аукциона необходимо наличие не менее двух участников. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, аг. Мухавец, ул. 60 лет Октября, 21 (в здании сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления – **17 января 2020 г.** до 17.00. Дополнительную информацию о земельном участке можно получить по телефонам: 94 71 36, 94 71 35, 94 74 30.

# Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 14 января 2020 года

| № лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Начальная цена (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Условия продажи | Характеристика объекта |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1* | Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18248 (турбаза) | Гродненская область, Гродненский район, Озерский с/с, а. г. Озеры, ул. Пионерская, д. 2 | 13 104,00 | 1310,40 | Без условий | Здание неустановленного назначения с составными частями и принадлежностями: пристройка (спортзал), покрытие территории, линия электропередачи 0,4 кВ, ограждение территории, трубопровод тепловой сети, трубопровод водопроводной сети, канализационная сеть. Год постройки – 1936. Площадь – 919,8 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422086505101001258 площадью 0,4018 га |
| 2* | Капитальное строение с инвентарным номером 401/С-18249 (котельная) | Гродненская область, Гродненский район, Озерский с/с, а. г. Озеры, ул. Пионерская, д. 2 | 1008,00 | 100,80 | Без условий | Здание неустановленного назначения с составными частями и принадлежностями: уборная, труба. Год постройки – 1990. Площадь – 71,0 кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 422086505101001258 площадью 0,4018 га |

* – Лот продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.
Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, тел.: (0152) 720537, 720010.
При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.
– **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов.
**Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Аукцион состоится 14 января 2020 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1**. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 407, в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и с 14.00 – 17.00 **с 16 декабря 2019 года по 8 января 2020 года.**
Телефоны для справок в Гродно: (0152) 720537, 720010. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by, gcn.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о снятии объекта с торгов

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона по продаже имущества открытого акционерного общества «Молодечнолес», назначенного на **16.12.2019 лотов № 1 (резак ацетиловый) и № 2 (компьютеры (4 шт.), принтер Canon MF44101, ПЭВМ «Сильверадо» LG (2 шт.), факсы «Панасоник» (3 шт.), набор «Премьер-1», мебель, спецодежда, котел стационарный, трансформатор ТС-10 КВ, шкаф КТП-25/10)**.

Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 30.11.2019 г. УНП 191381372

# Извещение о аукционе

| | |
|---|---|
| **Дата, время и место проведения аукциона** | 11 января 2020 года в 10.00 в здании Кубличского сельисполкома, аг. Кубличи |
| **Место, дата и время начало и окончания приема заявлений, прилагаемых документов** | Заявления принимаются с 11 декабря 2019 года до 8 января 2020 года включительно с 8.00 до 17.00 в рабочие дни в здании Кубличского сельского исполнительного комитета по адресу: Витебская область, Ушачский район, аг. Кубличи. Граждане представляют паспорт гражданина РБ, его ксерокопию и квитанцию об уплате задатка. Телефоны: 8-021-58-5-37-47; 5-37-41; (8-029) 813-55-07 |
| **Наименование объекта** | Земельный участок |
| **Целевое назначение** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| **Место расположения** | Витебская область, Ушачский район, д. Рыбаки |
| **Характеристика земельного участка** | Расположен в прибрежной полосе Селищанского озера |
| **Кадастровый номер** | № 224982808801000024 |
| **Площадь земельного участка (га)** | 0,2484 га |
| **Порядок осмотра на местности земельного участка, выставляемого на аукцион** | Осмотр земельного участка будет производиться по обращению граждан в комиссию по проведению аукционов |
| **Начальная цена, белорусских рублей** | 3000,00 рублей |
| **Размер задатка, белорусских рублей** | 300,00 белорусских рублей, уплачивается при подаче заявления на регистрацию участника аукциона. Получатель: Кубличский сельский исполнительный комитет, р/с BY70AKBB36043280511632300000 ф-л 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY21216 г. Полоцк УНП 300007216, код платежа 04901 |
| **Условия продажи объекта** | Внесение победителем аукциона платы за земельный участок, возмещение расходов, связанных с изготовлением документации и его проведением, – 1851 рубль 47 копеек + затраты за опубликование объявления |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 430/С-21369 (назначение – здание специализированное для образования и воспитания, наименование – детский садик), общей площадью 276,7 кв. м, расположенное по адресу: Новогрудский р-н, Вселюбский с/с, а. г. Отминово, ул. Центральная, 48Л

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424384404601000004, площадью 0,2872 га (назначение – земельный участок для размещения объектов образования и воспитания), находящемся по адресу: Новогрудский р-н, Вселюбский с/с, а. г. Отминово, ул. Центральная, 48Л. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0163 га

**Начальная цена продажи – 4 440 руб.** (четыре тысячи четыреста сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 444 руб. (четыреста сорок четыре рубля)

**Продавец** – ОАО «Лидахлебопродукт», 231300, г. Лида, ул. Булата, 1, тел. 8-0154-65-25-01, факс 8-0154-65-25-60

**Организатор торгов** – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 55-87-70, 55-87-71

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 26 декабря 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона **http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku**
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 29.06.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 23 декабря 2019 г. до 15.00**

*Телефон для справок* 55-87-71 – *Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация* http://grodnoino.by

# СІМФОНІЯ ЖЫЦЦЯ

У адзін з майскіх дзён 1991 года да мяне ў рэдакцыю «Советской Белоруссии» завітаў Іван Шамякін.

— Вось вырашыў заглянуць, паглядзець, як ты тут уладкаваўся. А-а?.. — яшчэ з парога замест прывітання загаварыў ён.

— Іван Пятровіч! — абрадаваўся я нечаканаму, але такому дарагому госцю. — Праходзьце, калі ласка. Распранайцеся...

Тады яшчэ не было моды заказваць сакратарцы чай альбо каву, таму мы проста прыселі ў канец стала, за якім звычайна праходзілі пасяджэнні рэдакцыйнай калегіі.

Іван Пятровіч, агледзеўшыся, ухвальна сказаў:

— Нічога... Утульна. А-а?.. Даўно я не быў у гэтым кабінеце. Некалі яшчэ Зінін мяне прымаў...

— А вы былі знаёмыя?

— Дык мы ж разам засядалі ў Вярхоўным Савеце. Праціралі, так сказаць, штаны. А-а?.. — засмяяўся Шамякін.

— Шчаслівыя былі часы, Іван Пятровіч! А што творыцца цяпер? Што творыцца...

— Перабудова, ліха яе матары! Відаць, неспакойна цяпер і ў вас, у рэдакцыі?

— Яшчэ як! Мы ж, можна сказаць, на пярэднім краі. На перадавой.

І я расказаў Івану Пятровічу, як кожны артыкул, апублікаваны ў абарону існуючага ладу, выклікае буру гневу ад апазіцыйна настроеных чытачоў. Некалькі разоў яны збіраліся пад вокнамі рэдакцыі і дэманстратыўна палілі нашу газету. А нядаўна заходзіў Зянон Пазняк і не то жартам, не то ўсур'ёз пагражаў, што калі яны возьмуць уладу ў свае рукі, дык павесяць мяне на самым высокім слупе.

— Жах!.. — пахітаў галавой Іван Пятровіч. — Праўду кажуць кітайцы: не дай бог жыць у эпоху перамен.

— Дык вам, у энцыклапедыі, крыху зацішней. Вы ж усё-такі ўбаку.

— Таксама хапае. На планёрках часам успыхваюць такія перапалкі, што ледзьве не да бойкі даходзіць. Раптам выявілася, што ў калектыве ёсць нямала прыхільнікаў БНФ. І калі раней яны сядзелі як мышы пад венікам, то цяпер нахабна, скандальна імкнуцца прасунуць у энцыклапедычныя даведнікі артыкулы кан'юктурныя, з сумнiўнымі ацэнкамі. Але ж энцыклапедыя робіцца не адзін год. І не на два. Усе звесткі, змешчаныя тут, павінны быць выверанымі, абсалютна дакладныя, аб'ектыўныя.

Пры гэтым Іван Пятровіч стаў наракаць, што ў грамадстве ўсё больш відавочнай становіцца трывожная тэндэнцыя: людзі перастаюць чытаць. Не, розныя нізкапробныя дэтэктывы ды парнаграфію купляюць, а вось мастацкую літаратуру... Дайшло да таго, што заказы на паэзію не перавышаюць трыста-пяцьсот экзэмпляраў. Ды такога нават у трыццатыя гады не было! Вось да чаго давяла нас праклятая перабудова...

— А я ж, — скрушна пахітаў галавою Іван Пятровіч, — напачатку шчыра ў яе паверыў. І як мог падтрымліваў Гарбачова. Даказваў, што на крутых паваротах не бывае без зрываў, правалаў, цяжкасцяў... А цяпер бачу, што гэты нікчэмны балбатун, калі не сказаць мацней, завёў краіну ў тупік. І самае страшнае, што ніякай праграмы па выхадзе з гэтага тупіка няма... Некаторыя спадзяюцца на Ельцына. А на маю думку, гэта — азартны палітычны гулец, хітрыган і спрактыкаваны інтрыган, для якога на першым месцы не інтарэсы народа, краіны, а свае карыслівыя мэты.



Я выказаў асцярожную думку, што нашы, беларускія кіраўнікі ўсё гэта разумеюць і стараюцца па меры магчымасці нівеліраваць згубныя наступствы.

— А якія ў нас магчымасці?.. — не пагадзіўся Іван Пятровіч. — Надрукаваць прапагандысцкі артыкул у вашай газеце, сабраць партыйны сход? Дык людзі ўжо не вераць нам. Калі штодзень перабоі з прадуктамі, дык якая тут можа быць ідэалогія. На нашых вачах адбываецца крушэнне ідэалаў. А людзі без ідэалаў — страшная рэч. Нездарма такі разгул злачыннасці... Страшна ад магчымасці сацыяльнага выбуху... І дзе пры гэтым нашы кіраўнікі? Той жа Сакалоў? Ён быў выдатны гаспадарнік на Брэстчыне, але цяпер, у крызісны час, аказаўся і не палітыкам, і не змагаром... Мы з табой на нядаўнім партыйным з'ездзе выбралі Малафеева. Зноў-такі як гаспадарнік ён прэтэнзій не выклікае. А як палітык? — Шамякін красамоўна развёў рукамі: — Баіцца выказаць сваю думку. Разгублены, спалоханы... Шушкевіч? Хай бы ён лепш вучыў студэнтаў, займаўся сваёй справай. Ягоны бацька любіў у нас выступаць на кожным сходзе. Але часта — як у лужу... І таму сур'ёзна не ўспрымаўся. Я і малодшага Шушкевіча не магу ўспрымаць сур'ёзна.

— Іван Пятровіч, а калі б тады, на з'ездзе, выбралі Бровікава, можа, сітуацыя ў нас сёння была б іншая?

— Сумняваюся. Хто такі Бровікаў? Журналіст, які не адбыўся. Партработнік, які нідзе доўга не затрымаўся. Нічым сябе не праявіў і як кіраўнік урада. Таму і апынуўся на пасадзе пасла ў Польшчы... Адзіная ягоная заслуга, што ён асмеліўся на пленуме ЦК выступіць з крытыкай курса Гарбачова. Але ж гэтага мала для сур'ёзнага палітыка... Да таго ж, ён вельмі хворы чалавек.

— Дык на каго ж цяпер надзея, Іван Пятровіч? На інтэлігенцыю?

— Пра інтэлігенцыю некалі слушна сказаў Ленін. І яна цяпер цалкам апраўдвае забойчую ленінскую характарыстыку. Адна частка нашай хвалёнай інтэлігенцыі кінулася падпяваць разбуральнікам, аплёўваць усіх і ўсё. А другая — стаілася, замёрла, чакае, куды павернецца ход падзей.

Гэткае ж раздзяленне адбылося і сярод нас, пісьменнікаў. На вялікі жаль, крыкуноў, гарлапанаў-дэмагогаў аказалася занадта многа. Разам з так званай галоснасцю, свабодай слова прыйшла поўная анархія, беспакаранае аплёўванне чалавека і гісторыі. Што пішуць! Што паказваюць! Жах...

Нас, старэйшых, тых, хто стаіць на патрыятычных пазіцыях, называюць саўкамі, камунякамі, а нашыя творы — саўдэпаўскімі агіткамі... Так, кнігі нашыя прасякнуты ідэалогіяй, якой мы сумленна і шчыра служылі. Але па сваёй сутнасці гэта была ідэалогія глыбока гуманная, чалавечная. А сёння камусьці вельмі хочацца зрабіць людзей жывёламі...

Каб адысці ад размовы пра палітыку, якая прыкметна ўзрушыла, усхвалявала Шамякіна, я папытаўся ў яго пра здароўе.

— А, — махнуў рукою Іван Пятровіч, — якое там здароўе ў такіх умовах. Пакутую ад бяссонніцы. Прачнуся сярод ночы і не магу заснуць да раніцы, усё думаю, перажываю... Ад гэтага мае хворыя сасуды даймаюць мяне яшчэ горш... Дый узрост ужо, што ні кажы, не юначы. Некалі я мог па дзесяцьпятнаццаць гадзін сядзець за пісьмовым сталом. А цяпер... Нават паперы добрай не маю, пішу на нявыкарыстаных дэпутацкіх бланках.

— Дык усё-такі нешта пішацца?

— Трохі пішацца... От і для вашай газеты прынёс невялікі ўрывак са свайго дзённіка за апошні год.

— Выдатна! А я ўжо хацеў званіць вам, прасіць што-небудзь для публікацыі.

— Ну, значыць, нашы жаданні супалі. Дзякую!

Мы цёпла развіталіся, і Шамякін пайшоў. А ў мяне яшчэ доўга шчымела сэрца. Ніколі раней, за ўсе гады нашага знаёмства, не бачыў я Івана Пятровіча такім разгубленым, такім самотна-падаўленым...

Болей мы не сустракаліся. Падзеі ў краіне пачалі развівацца гэтак імкліва, з такімі катастрафічнымі наступствамі, што было не да сустрэч. Забаранілі Камуністычную партыю, а на камуністаў сталі вешаць усіх сабак. Развалілі Савецкі Саюз, і ў нацыянальных рэспубліках пачалася калатнеча. Беларусь апынулася на раздарожжы, у поўнай эканамічнай ізаляцыі. У краіне нарастала сацыяльная напружанасць — банкруціліся прамысловыя і сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. Упершыню людзі спазналі беспрацоўе, татальны дэфіцыт усяго.

Як жыў у гэты час Іван Шамякін? Цяжка, гаротна. Яго дзённік тых гадоў напоўнены смуткам, болем, а часам і адчаем. Івана Пятровіча хамавата, не па-людску выпіхнулі з «Энцыклапедыі», дзе ён быў галоўным рэдактарам. Ну як жа — камуняка! Амаль перасталі друкаваць, а калі друкавалі, то плацілі капеечныя ганарары, за якія цяжка было карміць сям'ю. Памёр сын Саша, у сорак гадоў. Памерла Марыя Філатаўна, любімая жонка, верная спадарожніца, нястомная памочніца. Самога даймалі невылечныя хваробы.

І самае дзіўнае, што ў гэтых умовах, у гэтых неверагодных абставінах пісьменнік думаў не толькі аб сваіх праблемах, але і аб тых бедах, якія зваліліся на народ, на краіну.

*«А сёння зноў на душы валун: адчуванне, што падыходжу да апошняй рысы. Не толькі я. Народ увесь. Ходзяць фантастычныя чуткі аб новым скачку цэн... Няўжо сілы, што разбурылі Дзяржаву, такія ўсемагутныя і такія помслівыя, што хочуць нас давесці да голаду і поўнага разбурэння?»*

*«Зноў у душы маёй трывога і роспач. Страх за дзяцей! І злосць на ўсіх — і на камуністаў, што аддалі ўладу без бою, і на дэмакратаў, якія бяздумна, па-дурному разбураюць усё, на чым трымалася жыццё. Гэта ж ідыятызм — так разбураць толькі па той прычыне, што гэта ствараласяся, будавалася камуністамі! Нямала яны зрабілі карыснага для народа. Ад таго і шалеюць ельцыны, паповы, пазьнякі...»*

*«Жыву палітыкай, літаратурай, кіно. Жыву жыццём народа, хварэю за яго беды. Здзіўляюся тым, хто ў эйфарыі ад таго, што адбылося ад развалу Саюза. Па-мойму, у такой эйфарыі — сытыя. «Бытие определяет сознание». Формула дасканалая і неаспрэчная».*

*«Літаратура марнее. Калі не знікне праблема публікацыі, тыражоў, літаратура пачне выраджацца, а за ёй — іншыя віды мастацтва і ўся культура. Такія могуць быць вынікі адраджэння, беларусізацыі».*

*«Дзіўна. Такі папулярны быў, столькі мне пісалі, запрашалі, а цяпер у беспрасветнай прасторы. Павіс. Апынуўся па-за часам...»*

*«Адно не лянуюся — пісаць. Заўтра здам кнігу і сяду за новую аповесць. Трэба пісаць! Хоць зрэдку апякае думка: а навошта? Для каго? І ўсё роўна — трэба пісаць!»*

І Шамякін — хвала нябёсам! — нягледзячы ні на што — пісаў. З адным жывым вокам, з незагойнай душэўнаю траўмаю, адольваючы фізічную нямогласць, пісаў. За нейкіх пятнаццаць гадоў стварыў два раманы і восем аповесцяў. У гэтых творах з усёй паўнатой, з любоўю і глыбокай спагадаю адлюстравана ўсё, чым мы жылі ў тыя суровыя гады.

Але заўсёды — і гэта натуральна — на першым месцы ў пісьменніка былі думкі, клопат пра лёс роднай мовы, пра росквіт беларускай літаратуры. Непазбыўны клопат на працягу ўсяго яго жыцця.

**Зіновій ПРЫГОДЗІЧ.**

Спяшайцеся ўбачыць!

# РАТАВАННЕ БЛАКІТАМ

## Шрага Царфін: схаванае становіцца яўным

**Па выстаўцы «Шрага Царфін. Той, хто вядзе да свята» ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі трэба хадзіць са знаўцам. З такім, напрыклад, як Юрый Абдурахманаў, галоўны куратар праекта. Бо проста так немагчыма ўбачыць усё, выяўленае на 52 прадстаўленых творах, калі не ведаць, на што глядзець.**



Парыжскія закаханыя. Каля 1960 года.

...Недзе ў хмызняку сядзіць качка — калі ліхтарыкам пасвяціць знізу, яна становіцца бачнай. І нават жывой — бо «пералятае» з карціны ў карціну, трэба толькі ведаць, дзе яе шукаць. І абавязкова з дадатковым святлом. Ці вось яшчэ можна заўважыць людзей, якія ідуць па змрочных вуліцах. У цемры не так проста ўбачыць мінакоў — дык карціны гэта якраз і адлюстроўваюць. І постаць парыжанкі становіцца яшчэ больш таямнічай: яна нібыта частка горада, яго нябачны дух, які вабіць скрозь адлегласці — прасторавыя і часавыя. Нездарма і Царфін апынуўся ў Парыжы — там ён сустрэў сваё каханне, там здзейсніў мару жыцця і стаў мастаком са сваім адметным стылем і вынаходніцтвамі, якія яшчэ толькі адкрываюцца нам.

Пра тое, як у кветках могуць хавацца дзяўчаты, ужо маглі ведаць тыя, хто цікавіліся творчасцю гэтага мастака парыжскай школы раней — яго творы час ад часу з'яўляліся ў вялікіх адмысловых праектах, прысвечаных мастакам — ураджэнцам Беларусі. Але ж цяпер адкрылася першая персанальная вялікая выстаўка, прымеркаваная да 120-годдзя Царфіна. І ёсць неверагодная магчымасць зразумець гэтага загадкавага творцу, дзякуючы работам рознага перыяду. Рэдкая магчымасць — таму што большасць твораў выстаўляецца ўпершыню, частка наогул была схаваная ад вачэй, бо знаходзіцца ў прыватных калекцыях, і зусім не факт, што з'явіцца яшчэ на якіх-небудзь выстаўках. Гэта эксклюзіў для Беларусі. Нават у Парыжы пра 120-годдзе Файбіша Царфіна згадаюць пазней...

І гэтаму ёсць тлумачэнне. Усё ж такі хлопчык, якога ў сям'і называлі Шрага, пачынаўся як мастак у Смілавічах. Любіў назіраць за працай старэйшага Хаіма Суціна, які ўжо даказаў бацькам, што хоча і будзе маляваць, — Царфіну было прасцей ісці гэтым шляхам. Ён нібыта будзе даганяць апантанага Хаіма: таксама паступіць у Віленскую мастацкую вучэльню, таксама апынецца ў Парыжы, праўда, праз Палесціну і Берлін — на гэта пойдзе 10 гадоў. Затое, апынуўшыся на Манмартры і ўхапіўшы творчага паветра, ён расставіць для сябе прыярытэты: жыць мастацтвам — не значыць ахвяраваць дзеля яго жыццём сваім і блізкіх. Таму ён будзе працаваць там, дзе рэальна зарабіць на годнае існаванне, будзе ствараць тканіны для парыжскіх модных дамоў, каб мастацтва было і аддушынай, і выключнай радасцю. Прыклад Суціна меў значэнне для яго і тут — таму яны разышліся ў парыжскім жыцці. Але менавіта Царфін стане тым чалавекам, які пакіне свае яркія ўспаміны пра знакамітага земляка са Смілавічаў Суціна. На выстаўцы ў Нацыянальным мастацкім ёсць аркушы з машынапісным тэкстам тых успамінаў, дзе рукой Царфіна дадзены ўдакладненні. І адмыслова з Парыжа прыехаў чамаданчык з яго палітрай. Па ёй адразу відаць, якія колеры найбольш любіў гэты мастак.

— Ён знайшоў уласныя колеры, хоць і захапляўся Суціным. Царфінскі сіні, яго блакіт і яго неба блізкія да колераў Эль Грэка, у нейкай ступені адчуваецца і ўплыў Сезана, — тлумачыць Юрый Абдурахманаў. — Але Царфін усё ж знайшоў уласны почырк. Тыя, хто робіць так, як ужо зрабілі да іх, заведама прайграюць. У мастацтве цікавыя тыя, хто робіць сваё.



Вялікі блакітны неф. Каля 1960 года.

Ён выпрацаваў уласную тэхніку — змешваў фарбы рознай прыроды: алей з гуашшу ці акварэллю, шчодра пакрываў творы лакам, каб надзейна замацаваць. А па самых творах можна адчуць яго стан у розныя перыяды жыцця. Яно падзялілася на некалькі этапаў. Адзін — даваенны, больш светлы, лёгкі, другі — напоўнены ўнутраным змрокам: мастак даведаўся пра смерць бацькоў у Смілавіцкім гета. Стасункі з імі ў перадваенныя гады ўжо даваліся няпроста — са сталінскага Савецкага Саюза ў буржуазную Францыю вестачкі перадаваліся абходнымі шляхамі, нейкі час выратаваннем быў Чырвоны Крыж. Пасля вайны Царфіна, які сам быў удзельнікам французскага Супраціўлення, вельмі змяніла вестка пра смерць бацькоў у смілавіцкім гета: цяпер яго творы стануць змрочнымі, на іх будуць выяўляцца людзі-здані, нібыта з іншага свету, якія існуць у карцінах адасоблена. Спатрэбіцца час, каб выйсці са змроку і знайсці той самы блакіт, які зробіць яго творы асабліва каштоўнымі, а сам Царфін стане пазнавальным мастаком.

Пазнаваць яго ў Беларусі цяпер магчыма дзякуючы групе кампаній А100, якая набыла шэраг твораў у сям'і мастака. Але сама ідэя нарадзілася ў пасольстве Беларусі ў Францыі, якое на той час узначальваў Павел Латушка, ён і ўключыўся ў стасункі з сям'ёй мастака. Перагаворы ішлі вельмі складана, доўжыліся восем месяцаў. Сям'я прадаваць работы не хацела, але вырашальным стаў той факт, што зварот сыходзіў ад Беларусі, і творы паабяцалі паказаць шырокай публіцы.

Вынік: у экспазіцыі творы адразу васьмі калекцыянераў, а пасля работы разыдуцца па розных прыватных зборах. На пастаяннай аснове ў экспазіцыю Нацыянальнага мастацкага музея ўваходзіць усяго некалькі карцін Царфіна, падараваных яго дачкой Лілін Дзюлак. Яна ж зрабіла падарунак Беларусі і гэтым разам. Падтрымаў маці падарункам ад сябе Іў Дзюлак, унук мастака, які прыехаў на адкрыццё выстаўкі разам са сваёй дачкой. Сваякоў Царфіна прыцягвае Беларусь: «Нас перапаўняюць эмоцыі, калі мы прыязджаем у Смілавічы. Тут захаваліся старыя магілкі з пахаваннем дзядулі Шрагі. Тут дагэтуль можна пабачыць маляўнічую раку Волму, якую пісалі і Суцін, і Царфін, « — адзначыў Іў Дзюлак. Сёння сваякоў Царфіна ў Беларусі няма. Затое ёсць працяг у Смілавічах — Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, дзе юныя землякі вялікіх мастакоў могуць рабіць свае першыя крокі. Ёсць музей «Прастора Хаіма Суціна», у якім адна з залаў называецца «Шрага Царфін. Вяртанне на радзіму», што таксама высока ацанілі замежныя госці.

«Вяртанне ў Рэспубліку Беларусь культурнай спадчыны знакамітых ураджэнцаў Беларусі з'яўляецца прыярытэтным кірункам культурнай дыпламатыі», — адзначыў міністр культуры Юрый Бондар у віншаванні арганізатарам выстаўкі, якая будзе доўжыцца да 19 лютага.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Спытайце пра радзіннае

# Ці патрэбны сваты на вяселлі?

**Пытанне ад Настассі Г., якая пражывае ў Крычаве Магілёўскай вобласці: «Сын надумаў жаніцца, прывёў у хату дзяўчыну і яе бацькоў, каб пазнаёміцца. Сталі вырашаць, хто будзе ладзіць вяселле. Мы мелі на ўвазе сватоў, але бацькі нявесты прапанавалі запрасіць тамаду. Ці патрэбны тады сваты на вяселлі?»**

Каму ж на вяселлі давяралі пачэсную ролю сватоў, якая была раней ледзь не самай галоўнай, бо дзякуючы іх непасрэднаму ўдзелу калісьці адбывалася сватаўство і «заручыны», якія папярэднічалі вяселлю? Вакол гэтых вясельных чыноў сфарміраваўся своеасаблівы кодэкс гонару, які сфакусіраваў тыя «залатыя» правілы традыцыйнага светапогляду, якія ставілі іх у цэнтр абрадавых падзей. Відаць, зусім невыпадкова першымі прэтэндэнтамі на ролю сватоў былі хросныя бацькі жаніха і нявесты.

Глядзіце самі. Хросныя бацькі былі на першым плане ўрачыстага застолля і ў дзень хрышчэння немаўляці, і на святочных радзінах, і ў дзень вяселля сваіх хрэснікаў, падводзячы тым самым рысу пад часам актыўнага ўзаемадзеяння ў кантэксце абрадавых падзей Роду.

Такім чынам, хросныя бацькі завяршалі этап духоўнага фарміравання маладых людзей, а шафер і шаферка, якія толькі ўваходзілі ў прастору будучага духоўнага настаўніцтва, павінны былі яе падхапіць (нагадваем: калі ў маладых нараджалася дзіця, першымі, каму яны павінны прапанаваць стаць хроснымі, былі шафер і шаферка з іх вяселля).

Этапам складанага абрадавага пераходу з аднаго стану маладых у іншы кіравалі сваты, якія павінны былі ведаць гісторыю жыцця маладых, іх сем'яў і сваякоў і праз прызму гэтых ведаў імкнуліся паўплываць на лёсы. У такім разе сват — звязвальная нітка паміж мінулым і будучым.

Калі ж хросныя бацькі не мелі звычаёвага права стаць сватам (прычынамі маглі стаць удаўство, смерць дзяцей, развод, другі шлюб) і сваццяй на вяселлі сваіх хрэснікаў, тады сватоў выбіралі «з боку».

Сватамі запрашалі людзей не маладзейшых за 40 гадоў, але і не пажылых: «...выбіраюць за свата гаспадара гадоў за сорак: маладзейшы не меў бы належнага аўтарытэту і паважнасці, а стары чалавек не здолеў бы выканаць абавязкі, якія патрабуе такая пасада, што вымагае надзвычай многа руху». Абавязкова ўлічвалі яго сямейнае становішча і наяўнасць дзяцей. Ніякіх сітуацый «недасканаласці» ў стаўленні іх не дапускаліся. Сватоў ацэньвалі па колькасці праведзеных імі вяселляў: чым больш, тым дасведчаней і мудрэй станавіліся гэтыя людзі.

У адпаведнасці з асноўнымі правіламі народнай культуры пары сватоў выбіралі з ліку сяброў, суседзяў, сваякоў, дасведчаных у мясцовых традыцыях, ва ўсіх іх хітраспляценнях і недагаворанасцях, якія валодалі артыстызмам, кемлівасцю, пачуццём такту і «багажом» прыказак, прымавак, цікавых гісторый, словам, умелых пагаварыць і павесяліць.

Народны вопыт перасцерагаў: таго, хто ўдзельнічаў у галоўных рытуалах пахавальнага абраду, больш ніколі не запрашалі ў сваты. У бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў мы пазнаёміліся з мілай супрацоўніцай, жанчынай сярэдніх гадоў, якая расказала нам, што добра ведае традыцыі беларускага вяселля, шмат гадоў яе запрашалі на імпрэзы ў якасці дасведчанай свацці. Але потым яна расплакалася і сказала, што ёй вельмі шкада, бо яна больш не зможа дапамагаць маладым людзям: нядаўна пахавала мужа. А народны этыкет і ўласная свядомасць забараняюць ёй у далейшым выконваць гэту галоўную ролю на вяселлі.

Такім чынам на вяселлі было чатыры пары сватоў. Лічыце самі: хросны бацька з жонкай і хросная маці з мужам з боку нявесты, хросны бацька з жонкай і хросная маці з мужам з боку жаніха. Наяўнасць жонак і дзяцей дазваляла хроснаму бацьку жаніха і хроснаму бацьку нявесты ўдзельнічаць у абрадах сватаўства. Наяўнасць мужа і дзяцей, гэта значыць шчаслівае замужжа, давала права хроснай маці нявесты і хроснай маці жаніха арганізоўваць падрыхтоўку вясельных караваяў для маладых адпаведна: «Каравай пяклі ўвечары перад вяселлем. Цяпер маладыя выносяць, а тады выносіла хросная з хросным. Мае хросныя ў мяне, яго — у яго».

Сёння практычна не запатрабавана асноўная функцыя свата і свацці — сватаць маладых людзей. Але, як і раней, на вяселлі прысутнічаюць людзі, якія перавязваюць ручнікамі і ўмоўна завуць сватамі. Таму сучасным маладым людзям хочацца параіць выбіраць у сваты шлюбныя пары з кожнага боку, не дазваляючы іх рытуальнага падзелу (гаворка ідзе пра сучасную, ці «гарадскую», традыцыю, калі сваццю выбіралі з боку нявесты, а свата — з боку жаніха). Перавязваючы сватоў ручнікамі, успомніце пра сімволіку правага (мужчынскага) і левага (жаночага) у абрадавым полі беларускай традыцыйнай культуры: ручнік свату завязваюць цераз левае плячо пад правую руку, а свацці, наадварот, цераз правае плячо пад левую руку.

І як тут не згадаць, што сёння ролю свата на вяселлі выконвае чалавек па прозвішчы «Тамада». Ад яго прафесіяналізму шмат у чым залежыць, у якім рэчышчы пройдзе вяселле — традыцыйны абрад злучэння двух родаў: з улікам традыцыйных духоўных каштоўнасцяў і выкананнем высокай культуры адносін ці абрад будзе ператвораны ў банальнае застолле, якое суправаджаецца анекдотамі і забаўкамі, а адсутнасць прафесійных ведаў кампенсуецца прымітыўнымі гульнямі... Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

Аксана КАТОВІЧ,
Янка КРУК.

***Дасылайце свае пытанні пра карані і прыстасаванасць да сучаснага жыцця каляндарных і сямейна-побытавых народных традыцый і абрадаў на паштовы або электронны адрас рэдакцыі з пазнакай «Пра радзіннае».***





# «КАЛЫХАНКА» — БЯСКОНЦАЯ РАДАСЦЬ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Першыя фотаздымкі «Калыханкі» мне пашчасціла зрабіць у далёкім дзевяноста першым годзе мінулага стагоддзя: майскім днём гурт быў запрошаны ў музей народнай архітэктуры і побыту, каб паказаць сваё майстэрства выканання абрадавых песень і гульняў. На той час «Калыханку» ўжо добра ведалі ў коле аматараў беларускага фальклору, хоць гурту было ўсяго толькі два гадочкі. На памяць ад той сустрэчы застаўся чорна-белы фотаздымак, на якім дзяўчынкі выглядваюць з вялікай бочкі...

Вядомасці юнага калектыву ў першую чаргу паспрыяла тая акалічнасць, што гурт быў сапраўдным эксклюзівам на небасхіле адраджэння фальклорнай спадчыны, адным з першых у краіне дзіцячых калектываў, які выконваў старажытныя народныя, у тым ліку і мясцовыя рэгіянальныя песні. Апранутыя ў аўтэнтычныя строі (большасць з якіх вышыты рукамі кіраўніка гурта), на канцэртах «калыханкаўцы» выклікалі і выклікаюць у гледачоў сапраўднае захапленне. Нездарма на «Калыханку» кажуць, што гэта сапраўдны творчы эксперымент спасціжэння і далучэння дзяцей да нашай песеннай культуры. А яшчэ гэта — жыццёвы праект апантанага і няўрымслівага кіраўніка, улюбёнага ў тэатр, песні і казкі Ларысы Рыжковай. Ларыса Мікалаеўна ў свой час удзельнічала ў тэлевізійнай дзіцячай перадачы «Калыханка» — яна распавядала і інсцэніравала для маленькіх гледачоў казкі, забаўлянкі, песні.

— Аднойчы для казачнага сюжэта перад камерай неабходна было здымаць некалькі малалетніх артыстаў, якіх я знайшла па суседстве, у Міханавічах. Пазней яны — вучні міханавіцкай школы і сталі першым складам «Калыханкі», — дзеліцца сваімі ўспамінамі Ларыса Рыжкова.

За трыццаць гадоў вырасла не адно пакаленне «калыханкаўцаў», больш за восемдзесят спевакоў выйшла з яе складу. На замену старэйшаму пакаленню прыходзяць падлеткі, нават дашкаляты — дзеці былых удзельнікаў. Ларыса Мікалаеўна заўсёды сцвярджае, што яе гурт — гэта не ўстанова, дзе рыхтуюць прафесійных спевакоў — тут далучаюцца да жывой песні, адкрываюць чысты, непаўторны голас. Па-ранейшаму гурт удзельнічае ў самых розных імпрэзах і заўсёды становіцца цэнтрам увагі — на фестывалях, канцэртах, конкурсах, у песенных праектах і абрадавых дзеяннях. Ніводзін канцэрт у роднай міханавіцкай школе не абыходзіцца без удзелу «калыханкаўцаў», бо ў будынку школы праходзяць рэпетыцыі, сустрэчы. З нагоды юбілею ў міханавіцкай альма-матар прайшло і святочнае выступленне гурта, якое сабрала і былых, і цяперашніх яго ўдзельнікаў.

— «Калыханка» — бясконцая радасць! — сказала Ларыса Рыжкова пра свой калектыў. — Якое шчасце бачыць, як узрастаюць няспелыя дзіцячыя душы, як з'яўляецца энергетыка ў звонкіх дзіцячых галасах, свабода ў рухах і паводзінах, што ў гульнях і песнях раскрываецца і замацоўваецца іхнія здольнасці!

На гэтых здымках, зробленых у розныя часы і на розных падзеях, вядома ж, «Калыханка».

**Анатоль КЛЯШЧУК,**
**фота аўтара.**







## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 14.01.2020 открытого аукциона

Лот № 1: **изолированное помещение с инв. № 700/D-148808 – помещение № 3,** площадь – 469,5 кв. м, с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием двора площадью 1011,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гомельское шоссе, 5/3-3.
***Начальная цена продажи: 70 600,00 белорусских рублей с учетом НДС. Сумма задатка – 7060,00 бел. руб.***
Лот № 2: **изолированное помещение с инв. № 700/D-148770 – помещение № 2,** площадью – 534,3 кв. м, с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием двора площадью 599,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гомельское шоссе, 5/2-2.
***Начальная цена продажи: 94 400,00 белорусских рублей с учетом НДС. Сумма задатка – 9440,00 бел. руб.***
Лот № 3: **изолированное помещение с инв. № 700/D-148771 – помещение № 3** площадью – 1009,7 кв. м, с входящим в его состав асфальтобетонным покрытием двора площадью 717,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гомельское шоссе, 5/2-3.
***Начальная цена продажи: 169 500,00 белорусских рублей с учетом НДС. Сумма задатка – 16 950,00 бел. руб.***
Лот № 4: **капитальное строение с инв. № 700/С-50305 – здание производственного корпуса,** площадью – 857,4 кв. м, с входящими в его состав: моечной площадью 169 кв. м, тамбуром площадью 3 кв. м, тамбуром площадью 2 кв. м, асфальтобетонным покрытием площадью 4750,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Гомельское шоссе, 5/4.
***Начальная цена продажи: 114 200,00 белорусских рублей с учетом НДС. Сумма задатка – 11 420,00 бел. руб.***
Лоты №№ 1–4 расположены на земельном участке с кадастровым номером 740100000007004955. Отдельные земельные участки для обслуживания каждого из лотов не выделены

**Аукцион состоится 14 января 2020 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок (подаются лично) и внесения задатка: 13 января 2020 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс», УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

**Порядок проведения аукциона:** для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона в соответствии с выдаваемым в день проведения аукциона счетом-фактурой. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, **Mogilev@ino.by.** Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25

## ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион по продаже имущества ООО «БЕЛМЕТСТРОЙСЕРВИС»

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

**Продавец:** ООО «БЕЛМЕТСТРОЙСЕРВИС» (УНП 190421288) в лице ликвидатора Д. А. Куприянова.

Публичные торги (далее – торги) будут проведены **26 декабря 2019 г.**, 09.00–17.00 на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов – **капитальное строение, инв. № 500/С-1684 – здание административно-хозяйственное общей площадью 706,86 кв. м** (344,0 кв. м до реконструкции) по адресу: **г. Минск, ул. Фабрициуса, д. 8.** Начальная цена – 719 712,00 бел. руб., в т. ч. НДС по ставке 20 %. Шаг торгов – 35 985,60 бел. руб., задаток – 71 971,20 бел. руб.

**Для участия в торгах необходимо** в срок по **24 декабря 2019 г. 17.00:** 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **BELTORGI.BY;** 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

